ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 52 (2218)
2 ліпеня 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

3 ЛІПЕНЯ — ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ МІНСКА

ЧАС, ЯКІ ЗАЎСЕДЫ З ТАБОЙ

Мінск, 3 ліпеня 1944 года. Праз некалькі хвілін гэты чырвоны сцяг залунае над Домам урада.

«Яны прыйшлі на партызанскі парад у Віцебску разам — бацька і дачка Рыдлеўскія.

Гродна. Толькі што з горада выбіты фашысты...

Яшчэ ўчора яны вызвалялі Мінск...

ГЭТЫ дзень стаў памятнай датай у календарах.

І зарубкай у нашых сэрцах.

Не так і многа прыпадае на год дзён, якія выклікалі б у мінчан столькі ўспамінаў і асацыяцый, як 3-е ліпеня.

І не толькі ў мінчан.

У гэтую пару дваццаць чатыры гады назад уся краіна, увесь свет з радасцю, гонарам, надзеяй глядзелі на карту Беларусі. Магутнай лавінай ішлі па зямлі Скарыны і Купалы тры Беларускія франты, вызваляючы яе гераічны спакутаваны народ.

Угледзься, таварыш, у здымкі, што захаваліся з тых незабыўных дзён. У здымкі, што сталі ўжо цяпер і застануцца на стагоддзі найкаштоўнейшымі рэліквіямі.

Вось так яно выглядала, наша вызваленне.

Вось такой яна запомнілася, наша перамога.

Гордымі, урачыстымі крыламі чырвоных сцягоў на самых дарагіх, самых святых для нас месцах гарадоў і вёсак.

Гідліва скінутымі долу знакамі ўчарашняга чорнага дня.

Прыгожым, мужным абліччам людзей, што ўвасаблялі наша вызваленне.

Рупнай думай працаўніка-хлебароба пра заўтрашні дзень народа-пераможца.

Прагай салдацкіх рук да мірных спраў.

Дваццаць чацвёрты раз мы адзначаем з тае пары 3-е ліпеня як усенароднае свята. Свята ратнага подзвігу Беларусі і подзвігу мірнага, стваральнага.

З новай сілай усведамляем мы ў гэты дзень, як многа трэба было зрабіць, каб на месцы спапялёнага Мінска вырас горад—асілак і прыгажун. Мы захапляемся ім самі, мы ганарымся захапленнем гасцей, і мы заўсёды памятаем — пачынаецца сённяшні казачны Мінск з таго моманту, калі натруджаныя салдацкія рукі дваццаць чатыры гады назад ашчадна збіралі і ачышчалі на яго руінах счарнелыя, абгарэлыя цагліны.

І сённяшняя шчодрасць і красаванне палёў беларускіх — таксама адтуль, ад рупнасці селяніна, што ў трывожным і радасным сорак чацвёртым выходзіў на палетак з дзедавай сяўнёй.

І ўсё, чым мы жывём, пра што марым, шчаслівая ява, ясная будучыня, ды нават проста факт нашага з табой існавання—хіба не ў самай моцнай сувязі з днямі, даніну якім мы з пашанай штогод аддаём!

Тыя дні заўсёды з намі...

Першая вясна на вызваленай зямлі.

Фотаздымкі з Дзяржаўнага рэспубліканскага архіва кінафотафонадакументаў.

ГОРАД НАШАГА ШЧАСЦЯ

Расказ ветэрана Мінскага аўтамабільнага, былога партызана Анатоля Міхайлавіча БАДАНІНА

СКАЗАЦЬ па праўдзе, дык я і не памятаю, каб хто тым сонечным ліпеньскім ранкам нас фатаграфаваў. І раптам праз многа гадоў хаджу па залах музея—бачу: фатаграфія. На ёй братва наша партызанская—хто ў чым, на грудзях ордэны, медалі, за плячыма аўтаматы і стрэльбы... Адкуль, думаю, хлопцы, можа з нашай брыгады «Смерць фашызму»? Чытаю: «Партызанскі парад у Мінску ў гонар вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Чакай, чакай,дык і я ж таксама ўдзельнічаў у гэтым парадзе! Ну, так, вунь яны, сцяганосцы, а там трыбуна... Усё правільна. А я недзе тут у канцы калоны павінен быць. Не, на картцы не відаць... Засланіў, відаць, нехта...

Доўга стаяў я перад фотаздымкам і ўспамінаў. І ўспомнілася, браткі, усё чыста. Маладосць баявая, сябры-таварышы, з якімі прайшоў партызанскімі сцежкамі. Мне тады, як сыну цяпер майму—дваццаць два было. Пад Магілёвам трапіў у палон. Потым у лагер ваеннапалонных, не да ночы хай будзе сказана... У канцы сорак другога збегла нас некалькі хлопцаў з лагера. Ну, і трапілі, значыць, у партызанскую брыгаду «Смерць фашызму», у атрад імя Кутузава, якім камандаваў Дзёмін Іван Міхайлавіч, наш дырэктар цяперашні...

Дыслацыравалася брыгада (бачыце, не забыў я ваенную мову) у барысаўскіх лясах. Адсюль рабілі рэйды і пад самы Мінск, і далей. Калі фрыцы ў сорак чацвёртым трапілі ў Мінскі кацёл, дык мы памагалі часцям Савецкай Арміі біць іх тут. Потым прачэсвалі лясы—лавілі асобныя групкі фашыстаў. Памятаю, мы з-за гэтага прачэсвання ледзь на парад не спазніліся...

Вось тады я ўпершыню трапіў у Мінск. Ну, думаў, пагляджу, якая яна, сталіца наша. Адразу і ўбачыў. Не жыў тут, а сэрца крывёю аблілося. Я зараз дзецям пачынаю расказваць пра той зруйнаваны ўшчэнт Мінск, дык па вачах бачу — і вераць, і не вераць...

А я, памятаю, ішоў тады па Савецкай — яна да вайны цэнтральнай вуліцай была — глядзеў на кучы бітай цэглы, на чорныя акяніцы каробак і думаў: бацюхны, як жа ўсё гэта падняць? Ды ці толькі пра Мінск думалася. Я ўжо ад хлопцаў чуў, што і Гомель, і Віцебск, і іншыя гарады ляжаць у руінах, ну а пра вёскі і казаць няма чаго — сам бачыў, што нарнікі з нашымі вёскамі рабілі...

Але ж паднялі! Ды што — паднялі... Яшчэ ў сто разоў зрабілі лепшымі, чым былі да вайны! Такая, разумееш, моц у народа... Мне нядаўна сын з арміі прыслаў выразку з газеты. Чытаю, хай ты грэц—пра мяне піша. Нешта такое, што, маўляў, тут, далёка ад Беларусі, ён штодзень бачыць асілкі-мазы і сэрца яго поўніцца гонарам, бо ў іх частка працы і яго бацькі... Бач ты, навучыўся прыгожа пісаць. Так, сынок, не адна кашуля сапрэла ад поту ў твайго бацькі і яго таварышаў, пакуль пабеглі па дарогах Радзімы гэтыя, як ты пішаш, «асілкі на калёсах».

Тады адразу пасля партызанскага параду сабраліся мы—хлопцы-партызаны і пачалі раіцца, што далей... Ну, каму ў армію—таму ясна. Мяне ж па ранненні ў армію не бралі, і яшчэ такіх многа было. Раптам нехта і гаворыць:

— Чуў я, хлопцы, пад Мінскам пачынае будавацца аўтамабільны завод. Гайда туды, га?

— Хо-хо-хо, ха-ха-ха... Во хапіў, тут вайна ідзе, горад ушчэнт разбураны, а яму завод аўтамабільны будаваць будуць. Можа, яшчэ легкавушкі? Фордзікі?

Адк'м словам, паднялі хлопца на смех. А ён сваё — маўляў, чуў ад шафёра аднаго начальніка. А шафёр гэты чалавек сур'ёзны—брахаць не будзе...

— У які бок ад Мінска?—пацікавіўся я.

— А па Магілёўскай шашы. Кіламетраў дзесяць ад горада. Называецца Чырвонае ўрочышча...

І вось патэпаў я з хлопцамі ў гэтае Чырвонае ўрочышча. Лес тады пачынаўся ледзь не адразу за Сляпянкай. Ідзём мы, значыць, лясной дарогай, размаўляем, марым. Кажуць, чалавечая мара, хто яго ведае, як далёка ўперад ляціць. Ну, а мы пра што тады марылі? Што пройдзе некалькі гадоў, і сюды прыйдзе горад, што тут, дзе шумяць сосны, раскінуцца кварталы шматпавярховых дамоў? Э, не. Так высока нашы мары не ляталі.

Праз якія гадзіны дзве дабраліся да месца. Ну, што за месца—лес, а сярод лесу паляна вялікая. На паляне зямлянкі, баракаў колькі і яшчэ нейкая цагляная будыніна—ці то склад, ці то майстэрня...

Прынялі нас. Далі рыдлёўкі. Ну і пайшло, і паехала. Ох і згаладаліся рукі нашы па працы! Укалвалі, як цяпер кажуць, да сёмага поту. Карчавалі дрэвы, капалі траншэі, разгружалі цэглу. І ручкамі, ручкамі... Ні экскаватараў, ні бульдозераў, пад'ёмнікаў розных і звання не было.

Я зараз успамінаю той час, таварышаў сваіх і думаю: з якім імпэтам, з якой весялосцю браліся, не, лепш сказаць — кідаліся мы на ўсякую работу. Жыло ў народзе неўміручае імкненне, нязгаснае жаданне хутчэй залячыць раны, што нанесла нам вайна.

Некалькі гадоў назад я слухаў лекцыю. Лектар сказаў, што на Захадзе многія спецыялісты гаварылі адразу пасля вайны, што адбудаваць разбуранае фашыстамі Саветам удасца толькі гадоў праз пяцьдзесят! На-ка, выкусі! Пяцьдзесят гадоў... Мы менш, чым за палавіну гэтага тэрміну ператварылі зямлю нашу ў квітнеючы край.

...З Лідай, жонкай, апошнія гады працуем мы ў адным цэху—ліцейным. Звычайна нават у адну змену. Так што разам на работу, разам дахаты. Вось і сёння, напярэдадні свята вызвалення выйдзем, як звычайна, з заводскіх варот і па цяністых шырокіх вуліцах нашага пасёлка пакрочым на сваю Падшыпнікавую...

Я не ведаю, пра што мы з Лідай будзем гаварыць па дарозе. Мо ўспомнім пра мінулае. Ліда ж таксама былая партызанка. Яна, як я,—ветэран завода, больш за дваццаць гадоў працуе тут... Тут, на заводзе, у сорак пятым і пажаніліся...

Не люблю гучных слоў, саромеюся іх, а, бывае, карціць спытаць у жонкі: «Ці задаволена ты, Ліда, пражытымі гадамі?» Што да мяне, дык я—вельмі. Усяго было ў пасляваенны час—хапіла нястачы, цяжкасцей, але ж выдужылі, перамаглі. І вось, думаю, не трэба мне лепшай долі за тую, што ёсць.

А Лідзе? Хапіла ж і ёй. Трох дзяцей гадавала. Ну і на заводзе—нялёгкі хлеб. Скажу я вам, працаўніца яна не з апошніх. Летась была ўзнагароджана ордэнам Леніна, у партыю прынялі...

А хутчэй будзем гаварыць пра будучае. Пра дзяцей нашых. Старэйшы вось-вось вернецца з арміі. Піша: пайду працаваць на завод і буду завочна вучыцца. Другі сын некалькі дзён назад прынёс атэстат сталасці. І ў яго планы—далей вучыцца. Ну, і дачушка ў сёмы перайшла...

Так што, бачыце, жывое дажывае да радасці. Жывое... У дзень свята мы паднімем першую чарку за баявых сяброў, якім не выпала застацца ў жывых. А затым за наш светлы сённешні дзень, за нашых дзяцей, за тое, каб было над імі заўсёды чыстае, мірнае неба, каб спадарожнічала ім шчаслівая доля.

ПРАЦА І ПОШУК—ТАБЕ, АЙЧЫНА

Учора пад дэвізам «Наша праца і пошук—табе, Айчына» ў Маскве ў Цэнтральнай выставачнай зале адкрылася Усесаюзная выстаўка тэхнічнай і мастацкай творчасці выхаванцаў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў краіны. У 15 залах экспануецца больш за тысячу работ.

Права ўдзельнічаць ва Усесаюзнай выстаўцы заваявалі 16 прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў Беларусі. Цікавыя экспанаты прывезлі яны ў Маскву. Так, умельцы Мінскага гарадскога прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 12 сканструявалі электра-музычны інструмент, выхаванцы вучылішча № 10 — магнітафон-камбайн, які ўзнаўляе і гук, і колер.

Інкруставанае пано «Ленін у Разліве» зрабілі выхаванцы Бабруйскага мастацкага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча. Другое пано яны прысвяцілі 50-годдзю камсамола. Экспануецца таксама зроблены імі набор мэблі, выкананы ў нацыянальным стылі.

У час агляду тэхнічнай і мастацкай творчасці навучэнцаў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў будуць праведзены нацыянальныя дні саюзных рэспублік. Дзень Беларускай ССР—4 ліпеня.

СВЯТА МАЛАДЫХ

30 ЧЭРВЕНЯ КРАІНА АДЗНАЧЫЛА ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ

МІНСК

«Ляціць ад бацькоў да сыноў гераічных спраў эстафета». Так называлася тэатралізаванае свята, што адбылося ў нядзелю ў Мінскім цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага.

Шэсце адкрылі дзяўчаты ў спартыўнай форме. Яны неслі пяць ордэнаў, якімі ўзнагароджаны Ленінскі камсамол за працоўны гераізм і ратныя подзвігі маладых. А потым тэатралізаванае шэсце ад цэнтральных варот парку да велатрэка ўваскрасіла слаўную гісторыю барацьбы і перамог Ленінскага камсамола.

Па велатрэку рухаецца бранявік. На ім матрос, рабочы, салдат, дзяўчына-работніца ў чырвонай касынцы. На тачанцы імчыцца легендарны Чапаеў, ідуць Карчагін, камісар Берсан, матрос Жалязняк, героі першых пяцігодак.

Гучыць музыка славутай песні «Ідзе вайна народная». На машыне—макет свяшчэнных сцен Брэсцкай крэпасці. Потым гледачы бачаць бясстрашнага савецкага сокала Мікалая Гастэлу, слаўную партызанку Рыму Шаршнёву, падпольшчыцу Зіну Партнову, юнага партызана Марата Казея...

Грыміць салют перамогі, і на велатрэку пачынаецца парад пераможцаў. Наперадзе—салдат з дзяўчынкай на руках...

У Летнім тэатры парку для моладзі быў наладжаны літаратурна-музычны канцэрт.

ПОЛАЦК

«Не бойцеся дажджу і дрэннага надвор'я...» Такія плакаты былі развешаны ў Наваполацку, Полацку і бліжэйшых вёсках і пасёлках. Справа ў тым, што ў нядзелю ў горадзе беларускіх нафтавікоў, на плошчы Будаўнікоў, што раскінулася ў самым цэнтры горада над Дзвіной, павінна было адбыцца вялікае маладзёжнае свята. Аб гэтым ведалі ўсе: пра свята паведамлялі вялікія транспаранты, радыё, лістоўкі. І вось, як кажуць, у апошнюю мінуту стрэлка барометра ўпала. На нядзелю прагноз надвор'я быў самы несуцяшальны. Тады і з'явіліся плакаты, якія заклікалі не баяцца дажджу. І людзі не спалохаліся. З самай раніцы дзесяткі машын пад'язджалі да Палаца культуры нафтавікоў, куды вырашана было перанесці свята. Тут іх сустракалі гасцінныя гаспадары. Грымела музыка, дапазна не змаўкалі песні.

У канцэртах прыняло ўдзел больш за трыста ўдзельнікаў самадзейнасці. Наваполачане паказалі цікавыя танцавальныя і харавыя нумары. Госці з Полацка выступілі з вялікай цыркавой праграмай. Усе залы, фае і холы былі перапоўнены. Там праходзілі дыспуты, праводзіліся віктарыны, ішлі спаборніцтвы на спрытнасць, дасціпнасць і вынаходлівасць. Вялікую цікавасць выклікала выстаўка «Будні Наваполацка», на якой былі прадстаўлены апошнія работы самадзейных мастакоў. Адначасова праходзілі спаборніцтвы па тэнісу, валейболу, шахматах і шашках. У заключэнне адбыўся вялікі святочны баль.

Ніякая непагадзь не змагла перашкодзіць гэтаму вясёламу, радаснаму святу моладзі. Трэба толькі яшчэ дадаць, што поспеху яго дапамаглі мастакі Станіслаў Фадзееў і Васіль Цецяноха, якія здолелі шэры дзень зрабіць сонечным.

ДАРОГІ ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ

Калі скласці кіламетры маршрутаў, якія прайшлі на дарогах Беларусі ўдзельнікі фестывалю прафесіянальнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, дык атрымаецца адлегласць, роўная адлегласці ад Масквы да Уладзівастока. Сёння дарогі ўдзельнікаў фестывалю — па гарадах, пасёлках і вёсках Міншчыны.

Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР у гэтыя дні выязджаў з канцэртамі ў Пухавічы і Лагойск. Старэйшы творчы калектыў рэспублікі — Дзяржаўная акадэмічная капэла БССР выступала з канцэртамі ў мінскіх парках імя 50-годдзя Кастрычніка і Чалюскінцаў, а таксама ў Чэрвені, Старых Дарогах, Капылі.

Цёпла і сардэчна сустрэлі жыхары Капыля Дзяржаўны народны аркестр БССР.

Беларускія цымбалісты выступалі таксама ў Рудзенску, Плешчаніцах, Старых Дарогах. Выконваліся творы беларускіх кампазітараў Д. Смольскага, І. Лучанка, Н. Сакалоўскага, І. Жыновіча і іншых. Разам з аркестрам выступалі саліст оперы народны артыст БССР В. Чарнабаеў, салістка філармоніі І. Адзінцова, сола на цымбалах выконваў народны артыст БССР І. Жыновіч.

Самы малады калектыў Беларускай дзяржаўнай філармоніі — камерны аркестр пад кіраўніцтвам А. Янчанкі з поспехам выступіў у Мінску, Жодзіна, Барысаве і Маладзечна. Дзяржаўны ансамбль танца БССР паказваў сваё майстэрства жыхарам Нясвіжа і Слуцка. Эстрадныя брыгады філармоніі ўжо далі дзесяткі канцэртаў для рабочых і калгаснікаў Мінскай вобласці.

М. РУБІНШТЭЯН.

Мінск, 1968



На Паркавай магістралі.

Замалёўкі Ул. ПАШЧАСЦЕВА.

Мінск, 1968



У раёне Ракаўскай шашы.



Шарыкападшыпнікавы.

50 год БССР — Насустрач святкаванню юбілею

ПРЫНЯМОННЕ РЫХТУЕЦЦА ДА СВЯТА

А. ЛЫСКОЎ,
начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення культуры

ВЯЛІЗНАЯ лясная паляна. У задуменні абступілі яе з усіх бакоў кашлатыя сосны, беластвольныя бярозкі, трапяткія асіны. Лёгкі ветрык калыша чырвоныя сцягі, транспаранты. Прыглушаны гул коціцца па людскім натоўпе...

І вось настае цішыня. Паважным крокам выходзіць на паляну група людзей. Гэта ветэраны рэвалюцыі, героі працы ідуць запальваць факел. Успыхвае над палянай полымя — сімвал неўміручасці, вечнасці жыцця...

Палае факел. А на паляне разгортваецца маляўнічае тэатралізаванае відовішча. Карціна першая — «Чым ты была, Беларусь мая родная?» Лапцюжны, забіты край — так было да рэвалюцыі, так было і пры ўладзе польскіх памешчыкаў.

Дзвянне разгортваецца далей. Незабыўныя дні Кастрычніка... Утварэнне БССР... Гераічная барацьба працоўных Заходняй Беларусі ў гады панавання буржуазнай Польшчы... Радасць вызвалення...

«Вставай, страна огромная, вставай на смертный бой». Суровымі робяцца твары гледачоў. Многія, многія з іх памятаюць тыя грозныя гады. Беларусь няскораная, Беларусь у змаганні... Грозна шумяць партызанскія лясы... Змагаюцца камсамольцы-падпольшчыкі Скідзельшчыны... Гераічная смерць Вольгі Соламавай...

І нарэшце — сцяг Перамогі над рэйхстагам. Радасць жыцця, шчаслівай, стваральнай працы, барацьбы за мір.

Усё гэта ў жывых вобразах прайшло прад вачыма людзей, што сабраліся на паляне. Яшчэ і яшчэ раз кожны з прысутных успомніў пра цяжкае мінулае роднага краю, пра барацьбітоў, якія здабывалі ў бітвах шчасце, пра нязгасныя подзвігі савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта не магло не ўзрушыць людскія сэрцы, не магло не хвалявацць.

Перад прысутнымі выступіў першы сакратар Гродзенскага райкома партыі, Герой Сацыялістычнай працы П. Дайнека. Яго расказ — пра поспехі, пра радасныя навіны ў раёне. Яго ўспамін — пра грозныя гады вайны, калі П. Дайнека быў камісарам партызанскай брыгады.

Уважліва слухаюць людзі ветэранаў рэвалюцыйнага руху на Гродзеншчыне Ф. Цыгяльніцкую і В. Главіцкага. Яны нібы ўваскрашаюць падзеі паўвекавой даўнасці, удзельнікамі і сведкамі якіх былі.

Аб радасці мірнай, творчай працы гаворыць Герой Сацыялістычнай Працы трактарыст А. Клява.

А потым паляна стала арэнай весялосці. Загучэла музыка, зазвінелі песні, завіхурылі ў танцах юнакі і дзяўчаты...

Мы расказалі коратка пра тэатралізаванае свята-злёт працоўных Гродзенскага раёна, якое адбылося нядаўна. Такія мерапрыемствы сталі традыцыйнымі ў нас, на Гродзеншчыне. Асабліва пашырыліся яны сёлета, у юбілейным годзе нашай рэспублікі. Душой гэтых свят сталі шматлікія энтузіясты мастацкай самадзейнасці, работнікі культурна-асветных устаноў.

Падрыхтоўка да юбілею рэспублікі складае ў гэтыя дні аснову работы кожнага клуба, дома культуры, бібліятэкі, музея. Установы культуры вобласці распрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы па далейшым павышэнні ўзроўню сваёй работы, па развіцці мастацкай самадзейнасці, народнага выяўленчага мастацтва, краязнаўчай работы.

Культасветработнікі шырока выкарыстоўваюць такія выпрабаваныя формы масавай работы, як тэматычныя вечары і сустрэчы са знатнымі людзьмі, вусныя часопісы, канферэнцыі чытачоў, тэатралізаваныя святы, юбілейныя чытанні і г. д. Значную работу праводзяць культасветустановы па выхаванні людзей на слаўных баявых і працоўных традыцыях партыі і народа. З вялікай цікавасцю, напрыклад, слухалі жыхары вёскі Ендрыхоўцы і бліжэйшых населеных пунктаў Ваўкавыскага раёна вусны часопіс «Ад пакалення да пакалення», які быў праведзены ў сельскім клубе. Чатыры яго старонкі вуснамі жывых герояў, песнямі і вершамі расказалі пра барацьбу пакаленняў за светлае будучае. Выступілі Пётр Іванавіч Карасёў — былы член Ваўкавыскага рэўкома, удзельнік грамадзянскай вайны, Рыгор Іванавіч Шавякоў—дырэктар саўгаса «Рось», Герой Сацыялістычнай Працы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, перадавікі вытворчасці.

Цікавыя, змястоўныя тэматычныя вечары, сустрэчы, вусныя часопісы «Беларусь у мінулым і сучасным», «Шляхі бацькоў — дарогі сыноў» і на іншыя тэмы наладжваюцца ў Заазёрскім сельскім клубе Смаргонскага раёна, у Берастовіцкім раённым Доме культуры, у клубах Гродзенскага і Шчучынскага раёнаў. У гонар 50-годдзя БССР у Свіслацкім, Мастоўскім, Шчучынскім і іншых раёнах арганізавана «Эстафета працоўнай славы». Работнікі клубаў і бібліятэк, народных музеяў і чырвоных куткоў пішуць летапіс працоўных перамог сваіх аднавяскоўцаў. Перадачы эстафеты з сельсавета ў сельсавет праходзяць у святочных абставінах, па традыцыйным ужо рытуале.

Бібліятэкі вобласці ў юбілейным годзе таксама актывізавалі сваю работу з чытачамі. Палепшыліся прапаганда літаратуры, якая расказвае аб слаўнай гісторыі і дасягненнях Беларусі, папулярызацыя твораў беларускіх пісьменнікаў. Усюды арганізаваны новыя кніжныя выстаўкі, вітрыны, падборкі літаратуры да юбілею: «Радзіма мая дарагая», «50 векапомных, гераічных гадоў», «Квітней, родная Беларусь» і інш. Бібліятэчныя работнікі ўсё часцей арганізоўваюць масавыя мерапрыемствы непасрэдна на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах. Так, цэнтральная бібліятэка Гродна правяла вечары «Літаратурная Гродзеншчына» на азотнатукавым заводзе, заводзе аўтазапчастак і іншых прадпрыемствах горада.

Палепшылі бібліятэкі і краязнаўчую работу. Добра працуюць краязнаўцы ў бібліятэках Дзятлаўскага раёна. У Ваўкавыскай гарадской бібліятэцы ў краязнаўчай картатэцы, у альбоме «Наш горад родны», у папках «Гісторыя Ваўкавыска», «Ваўкавыск у пяцігодцы» сабраны багаты матэрыял па гісторыі рэспублікі, вобласці і горада.

Для паляпшэння работы культасветустаноў, іх добраўпарадкавання абласное ўпраўленне культуры, абком прафсаюза работнікаў культуры аб'явілі ў гэтым годзе грамадскі агляд усіх устаноў культуры. Як сведчаць факты, культасветработнікі многіх раёнаў, уключыўшыся ў гэты агляд, зрабілі ўжо шмат карыснага. Вынікі агляду намечана падвесці ў лістападзе.

У калгасах, саўгасах, на прадпрыемствах і ўстановах культуры разгарнулася падрыхтоўка да юбілейнага агляду мастацкай самадзейнасці. Каб павысіць ідэйны ўзровень рэпертуару і выканаўчае майстэрства самадзейных калектываў, упраўленне культуры і абласны Дом народнай творчасці аб'явілі рад конкурсаў па розных жанрах: сярод драматычных калектываў і народных тэатраў, агітбрыгад, індывідуальных выканаўцаў, народных умельцаў, аматараў бальных танцаў. Нядаўна ў абласным цэнтры ўжо адбыўся заключны тур конкурсу па сучасных бальных танцах. На раённых і гарадскіх конкурсах было выбрана 26 пар для паказу ў Гродна. Іх выступленне ў Гродзенскім гарадскім парку культуры і адпачынку было цудоўным відовішчам.

У гарадах і раёнах створаны аргкамітэты па падрыхтоўцы агляду мастацкай самадзейнасці. Зараз калектывы падбіраюць новы рэпертуар, аддаючы перавагу творам беларускіх аўтараў, усюды праводзяцца рэпетыцыі. У калгасах і саўгасах, на прадпрыемствах і ва ўстановах наладжваюцца абменныя канцэрты, выступленні агітбрыгад, ідзе падбор выканаўцаў на раённыя агляды.

Своеасаблівай рэпетыцыяй да раённых, гарадскіх і абласнога аглядаў, якія будуць праведзены ўвосень, з'явіліся раённыя вясновыя святы песні і працы. Яны паказалі, што многія самадзейныя калектывы папоўніліся новымі ўдзельнікамі, павысілі выканаўчае майстэрства. У Смаргонскім раёне, напрыклад, у параўнанні з мінулым годам колькасць удзельнікаў мастацкай самадзейнасці ўзрасла ўдвая. На сцэне выступала ўжо 28 мастацкіх калектываў — значна больш, чым летась. І так амаль у кожным раёне.

Рыхтуюцца да выступленняў у юбілейным годзе і нашы вядучыя калектывы — народныя ансамблі «Нёман» і ансамбль імя Агінскага Смаргонскага раённага Дома культуры, Бароўскі народны хор, калектывы Гродзенскага Палаца культуры тэкстыльшчыкаў, горада Ліды і інш. Старанна рыхтуемся мы да правядзення дзён вобласці ў Мінску. Падбіраем калектывы для выступлення на прадпрыемствах сталіцы, рэпертуар для іх, рыхтуем выстаўкі твораў нашых мастакоў, народных умельцаў і г. д.

У падрыхтоўку да юбілею рэспублікі ўключыліся нашы музеі. Абласны гісторыка-археалагічны музей у юбілейным годзе адкрыў новую абшырную экспазіцыю аддзела гісторыі дасавецкага і савецкага перыядаў. Нанава пераафармлены аддзел прыроды. Супрацоўнікі музея падрыхтавалі для публікацыі і выдання рад буклетаў, артыкулаў. 5 мая ў вобласці адкрыўся новы дзяржаўны музей — Дзятлаўскі музей народнай славы. У дзевяці залах двухпавярховага будынка сабраны цікавыя матэрыялы па гісторыі барацьбы працоўных Дзятлаўскага і суседніх з ім раёнаў за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, матэрыялы, якія апавядаюць пра радасныя змены ў жыцці працоўных пры Савецкай уладзе. Да юбілею рэспублікі новыя экспазіцыі адкрыты ў Лідскім, Слонімскім і Ваўкавыскім музеях. Расчыняюць дзверы і народныя музеі, экспанаты якіх расказваюць аб гісторыі калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў. Цяпер іх у вобласці больш за сорак.

Па-новаму арганізоўваюць сваю работу ў юбілейным годзе нашы паркі культуры і адпачынку. У іх афармленні і масавай рабоце пераважае юбілейная тэматыка, тэма 50-годдзя камсамола. У парках працуюць клубы цікавых сустрэч, наладжваюцца юбілейныя чытанні, праводзяцца дні прадпрыемстваў, балі, спартыўныя спаборніцтвы і г. д. Сістэматычна арганізоўваюцца тут справаздачныя канцэрты самадзейных калектываў, выступленні прафесіянальных артыстаў, тэатралізаваныя прадстаўленні. Паркі папоўніліся новымі збудаваннямі, атракцыёнамі.

У сувязі з падрыхтоўкай да юбілею рэспублікі і пераходам на пяцідзённы рабочы тыдзень аблвыканком прыняў рашэнне і зацвердзіў мерапрыемствы па паляпшэнні работы і ўмацаванні матэрыяльнай базы паркаў культуры. Ужо праведзены ў парадак паркавыя зоны ў гарадскіх пасёлках Берастовіца, Воранава, Дзятлава і іншых раённых цэнтрах. Сетка паркаў культуры і адпачынку ў вобласці павялічваецца. У чэрвені адкрыты парк у Слоніме.

Гэта, вядома, не азначае, што ў нас усюды, як кажуць, ажур. Ёсць у нас яшчэ і ўстановы культуры, якія масавыя мерапрыемствы праводзяць рэдка, мала праяўляюць ініцыятывы ў арганізацыі культурнага адпачынку людзей. Некаторыя калгасы, асабліва Іўеўскага, Воранаўскага, Астравецкага, Ваўкавыскага раёнаў, недастаткова клапоцяцца аб умацаванні матэрыяльнай базы ўстаноў культуры. Па-ранейшаму вострай застаецца праблема кадраў культасветработнікаў. Вялікія цяжкасці сустракаюцца ў падборы рэпертуару для самадзейнасці. Хочацца, каб і творчыя арганізацыі рэспублікі трымалі больш цесную сувязь з самадзейнымі калектывамі, дапамагалі ім.

Літаратура і Мастацтва 2

Аўторак, 2 ліпеня 1968 года

КІНО

У КАДРЫ — ПОДЗВІГ

У ПАЧАТКУ фільма «Пакараны смерцю ў 41-м» (сцэнарый В. Марозава, рэжысёр В. Чацверыкоў, аператар В. Арлоў) дыктар чытае пісьмо: «Масква, ЦК КПСС, таварышу Брэжневу. Прашу вас даць указанне, каб усе нашы цэнтральныя газеты і часопісы з больш падрабязным каментарыем змясцілі гэты здымак, узяты мною з «Пионерской правды»... Я ўвесь паранены, браты склалі галовы на палях баёў і гэта цярпіма, але нецярпіма, калі варонападобная гадзіна сцягвае пятлю на шыі хлопчыка-піянера... Мы ўсёй сям'ёю просім урад прысвоіць пасмяротна піянеру званне Героя Савецкага Саюза і паставіць яму помнік у цэнтры Мінска. Мы просім стварыць фільм пра гэтага юнага героя. Сям'я Кадаевых».

Стужка мінскіх кінадакументалістаў нібы выконвае заказ сям'і Кадаевых.

Расказ вядзецца ў форме інтэрв'ю. Перад намі праходзяць людзі, якія асабіста ведалі гераічнага мінскага школьніка Валодзю Шчарбацэвіча, мы чуем іх галасы, бачым месцы, дзе рос і змагаўся юны партызан.

Зразумела, такі кінарасказ не мог абысціся без дакументальных кадраў мінулых гадоў, у прыватнасці, без «цытат» з фотакіналетапісу ваеннай пары. Бывае, што мы, кінематаграфісты, звяртаемся да іх таму, што гэта лічыцца цяпер «сучасным» прыёмам; «модным». І хочацца павіншаваць рэжысёра В. Чацверыкова за тое, што ён з добрым пачуццём мастацкага густу, арганічна ўключае кадры старой кінахронікі ў сучасную размову пра героя. Яны ўносяць у фільм тое, што мы называем «подыхам часу», дакументальна замацоўваюць уражанне ад слоў, якія перад камерай гавораць сённяшнія сведкі і ўдзельнікі колішніх падзей, знятыя на фоне сучаснага горада або ў інтэр'еры.

Фільм не распадаецца на «мінулае» і на «сённяшняе» — ён гарманічны, зроблены на адзіным дыханні. Акцэнты расстаўлены ў ім мэтазгодна, агульны мантаж не парушаюць выпадковыя «адхіленні» ад тэмы.

Сюжэтна «Пакараны смерцю ў 41-м» будуецца па вядомай схеме, якую ў кінематографе ўмоўна называюць «пошук героя». Аўтары як бы разам з гледачамі даведваюцца пра ўсё новыя і новыя падрабязнасці жыцця і смерці адважнага юнага патрыёта, і гэтыя падрабязнасці складаюцца ў гісторыю подзвігу. Аднаго — і разам з тым такога, што ў ім адлюстроўваюцца характэрныя рысы часу і людзей ваеннай пары.

Здымкі сінхронных інтэрв'ю заўсёды бываюць тэхнічна і эмацыянальна вельмі складанымі для тых, хто здымае, і яшчэ больш для тых, каго здымаюць: трэба, каб чалавек натуральна трымаўся і гаварыў, калі перад ім мікрафон. Дадайце сюды цяжкасці, звязаныя з работай на натуры, неабходнасць «адключыцца» ад навакольных шумаў і г. д.

Віталь Чацверыкоў і Веніямін Арлоў, на мой погляд, добра справіліся з гэтымі задачамі. Кадры ў іх атрымаліся вельмі пераканаўчыя, асабліва тыя, дзе героі ўваскрашаюць ваенныя абставіны, якія робяцца для іх праз чвэрць стагоддзя сённяшнімі. Успомнім хоць бы гутарку з В. Барсуком, расказ Яўгеніі Фёдараўны на былой кватэры Шчарбацэвічаў. Тут няма зробленых мізансцэн, дзеючыя асобы паводзяць сябе так, як ім падказвае сэрца. Гэта надае стужцы прыкметы непаўторнасці. Майстэрства рэжысёра відаць у такіх кадрах, як праход па лесвіцы Яўгеніі Фёдараўны. Або яшчэ мантажныя стыкі: Валодзя ў дзіцячым узросце і — фатаграфія на цыбеніцы; фатаграфія пакарання смерцю маці і — трымценне асенняй лістоты на дрэвах у скверы... (І лісты, і дрэвы, дарэчы, выдатна зняты В. Арловым — яны ўносяць у эпізод лірыка-драматычную эмацыянальнасць).

Аўтарам удалося стварыць у кадрах натуральную атмасферу. Героі паводзяць сябе перад камерай непасрэдна, нібы іх і не здымаюць. Усім ладам стужкі рэжысёр настройвае гледача на глыбокае суперажыванне — фільм узрушае залу. Дасягнуць такога на здымачнай пляцоўцы і захаваць на экране — майстэрства.

Праўда, у часе здымак рэжысёра падсцерагалі няўдачы. Калі мы праглядалі першы варыянт фільма, кідалася ў вочы, як у пагоні за эмацыянальнасцю В. Чацверыкоў часам траціў пачуццё меры, трапляў у палон да матэрыялу. Залішне расцягненымі выглядалі, у прыватнасці, размовы з Яўгеніяй Фёдараўнай, з дачкой Трусава. Да таго ж адно інтэрв'ю — з Блажновым — не толькі было зацягнутае, але і тэхнічна дрэнна запісана. Не да месца ў фільм быў уманціраваны ўрывак са «Звычайнага фашызму». Парушаным аказаўся рытм апавядання, вялым атрымліваўся месцамі мантаж.

Пазней В. Чацверыкоў перарабіў фільм — з дзвюх частак зманціраваў адну. Зрабіў гэта творча. І стужка «Пакараны смерцю ў 41-м» значна выйграла ад гэтага. У такім выглядзе фільм і быў паказаны на традыцыйным фестывалі рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі і Малдавіі і атрымаў дыплом Саюза кінематаграфістаў СССР за ўдалы творчы пошук. Такім яго і дэманструюць цяпер на экранах краіны.

«Удалы творчы пошук»... У гэтых словах, па-мойму, дакладна перададзены асноўныя вартасці новай стужкі Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў пра піянера-героя Валодзю Шчарбацэвіча.

Віктар ДАШУК,
кінарэжысёр.

ДРУГАЯ РАДЗІМА

Гэтага пасівелага чалавека можна часта сустрэць на вуліцах Кобрына. Ён часта любуецца горадам, які стаў для яго назаўсёды родным і дарагім...

...Ішоў 1942 год. Дзень і ноч цераз невялікую, ціхую станцыю Лясы, што на Пружаншчыне, ішлі на фронт эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага. І аднойчы цішыню майскай раніцы парушыў страшэннай сілы выбух — недалёка ад станцыі сутыкнуліся і паляцелі пад адхон два эшалоны. Рух на чыгунцы Брэст—Масква быў спынен на 36 гадзін...

Арганізатарам дыверсіі быў дзяжурны па станцыі Генрых Рыфер.

Цікавы лёс у гэтага чалавека. Сын нямецкага рабочага-камуніста з правінцыі Касель, ён з дзяцінства зведаў нястачу. Падлеткам працаваў у бюргера па найму, затым — рабочым на чыгунцы.

Летам 1941 года салдат нямецкай арміі Рыфер быў пасланы на станцыю Лясы, а праз год ён прыйшоў у партызанскую брыгаду імя Чапаева Брэсцкага злучэння.

— Мне назаўсёды запомнілася першая сустрэча з партызанамі,—успамінае Генрых Мельхіёравіч. — Адбылася яна на кватэры сувязнога з вёскі Сасноўка Васіля Гука. Я вельмі хваляваўся. Уявіце, мне, немцу, суайчыннікі якога паляць навакольныя вёскі, катуюць жыхароў, прыйдзецца сустрэцца з жывымі партызанамі. У фашысцкіх газетах пра іх пісалі, як пра страшных бандытаў, якія забіваюць і рэжуць немцаў без разбору. І хоць я мала верыў прапагандзе, аднак неспакой не пакідаў мяне. І я здзівіўся, калі сустрэў у хаце Гука звычайных людзей з адкрытымі добразычлівымі тварамі. Адзін з іх уважліва назіраў за мной і ледзь прыкметна ўсміхаўся. Як потым аказалася, гэта быў камандзір брыгады імя Чапаева Канстанцін Сцяпанавіч Гапасюк.

Ад партызанскага камандавання Рыфер атрымаў заданне: сачыць за рухам воінскіх эшалонаў, іх грузамі, распаўсюджваць сярод салдат, што едуць на фронт, лістоўкі з паведамленнем Савінфармбюро.

З гэтай задачай Генрых спраўляўся адмыслова. Доўгі час фашысты яго ні ў чым не падазравалі. Аднойчы нават начальнік станцыі «за бездакорную службу» прадставіў яму адпачынак з выездам у Германію. У вялізным чамадане Рыфер вёз не падарункі бацькам, а лістоўкі на нямецкай мове са «Зваротам Савецкага ўрада да нямецкага народа».

А вярнуўшыся ў Лясы, Рыфер працягваў дапамагаць партызанам. У атрадах востра адчуваўся недахоп боепрыпасаў. Карыстаючыся правамі дзяжурнага па станцыі, Генрых спыніў у лесе паміж Лясамі і Аранчыцамі нямецкі эшалон. Аперацыя прайшла паспяхова. Партызаны ўзялі ў палон 280 фашыстаў і захапілі шмат боепрыпасаў.

Дыверсіі на чыгунцы не маглі застацца па-за ўвагай гестапа. Яно пачало больш пільна прыглядацца да Генрыха Рыфера, і камандаванне партызанскай брыгады прапанавала Рыферу тэрмінова пакінуць станцыю.

Пасля заканчэння вайны Генрых Рыфер не захацеў ехаць на радзіму (зараз тэрыторыя ФРГ). Ён атрымаў савецкае падданства, ажаніўся з былой сувязной Солтак, доўгі час працаваў на Кобрынскім гархарчкамбінаце. Зараз ён — на пенсіі.

І. ДАШЧЫНСКІ.

КАРЦІНА ПАЧЫНАЕ ЖЫЦЬ

ЧАСЦЕЙ за ўсё яшчэ карціны пачынаецца на вернісажы. А гэтую гледачы ўпершыню ўбачылі ў час сёлетняй абароны дыпломных работ выпускнікамі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Дружнымі воплескамі віталі новы твор першыя яго гледачы.

Добрая карціна ўспрымаецца вокаімгненна. Яна ўздзейнічае на гледача адразу — усім арсеналам прымененых мастаком сродкаў: сюжэтам, вобразамі, дэталямі, каларытам, колерам і г. д. Адразу ўсё ясна. І пасля ўжо ўжываешся ў карціну, асвойваеш душою і розумам тыя пласты пачуццяў і думак, што закладзены ў ёй.

Карціну Антона Валатовіча «Провады навабранца» хочацца разглядаць доўга. Яна—хвалюе.

Не магу не прыгадаць спрэчкі, якія вядуцца вакол сюжэтна-тэматычнай карціны. Некаторыя актыўна адвяргаюць так званы «літаратурны» пачатак у сюжэце: маўляў, сучасны твор жывапісу мусіць уздзейнічаць выключна пластычнымі якасцямі (колерам, рытмам, фактурай і г. д.), а калі ён паддаецца «пераказу», дык гэта ўжо быццам бы нейкі сурагат.

«Провады навабранца» выразна сведчаць, наколькі памыляюцца прыхільнікі такога пункту гледжання.

Добрая карціна — складанае адзінства. Арганічнае адзінства самых разнастайных кампанентаў. І калі нейкім з іх мастак ахвяруе — мабыць, ён непазбежна робіць свой твор менш дзейсным. Колькі мы бачылі на выстаўках палоцен маладых мастакоў, аўтары якіх, пагарджаючы «літаратурнасцю», тым самым пагарджалі і неабходным паглыбленнем у характары персанажаў, перадачай іх псіхалагічнага стану і г. д. Пластыка, рытміка, каларыт, якія б яны выразныя ні былі, ратавалі далёка не заўсёды.

Антон Валатовіч для сюжэтна-тэматычнай карціны скарыстаў усё. Усю зброю мастака. І мы бачым, як суладна, як гарманічна ўзаемадзейнічаюць у творы і лінейныя рытмы, і колер, і пластыка, і «літаратурны» (як яго назвалі б некаторыя) сюжэт карціны, і кожны з персанажаў. І ад гэтага ўзаемадзеяння нараджаецца жывая душа карціны.

Вабяць вобразы нашых сучаснікаў. Вабіць іх унутраны свет. Вабіць сам жывапіс, хоць месцамі палатно варта яшчэ прапісаць.

Сюжэт просты, але праз яго нямала сказана, аб чым думаюць сёння на зямлі ўсе. Аб мужнасці і рашучасці савецкага чалавека. Аб яго гатоўнасці да змагання. Аб яго волі да міру. Аб яго выпрабаваннях у мінулым. Так, так, пра ўсё гэта — роздум мастака. І не бачыць такога роздуму ў карціне «Провады навабранца» — азначала б не зразумець яе складаны асацыятыўны лад, яе поліфанію.

...Праводзяць навабранца... Праводзяць з добрым бацькоўскім клопатам. З упэўненасцю, што добра будзе служыцца хлопцу ў нашай арміі, хоць і нялёгка, бо такая ўжо «прафесія» — воін... І трывожыцца маці. І хвалюецца бацька, які прыгадвае сваё, перажытае. Ды ёсць і ўрачыстае ў гэтым жыццёвым моманце — ёсць пачуцці гордасці, што ідзе вось чалавек служыць у Савецкую Армію. Ёсць пачуцці трывогі — ці здолее ён быць вартым баявой славы дзядоў і бацькоў. Ёсць і пачуццё свята. Так, у нас провады навабранца ў мірны час — гэта свята. Усе складаныя настроі знайшлі ў карціне вобразнае ўвасабленне.

Хлопцу трэба ўжо ісці. Вось-вось павінен ён развітацца з маці. А за сталом двое — ці сваякі, ці знаёмыя — зацягнулі песню, згадваючы, мусіць, сваю ваенную службу. А хлопцу трэба пераступіць парог — складаныя пачуцці агарнулі яго: і сумна развітвацца з маці, ды яшчэ вось з гэтым дзяўчом, што прыйшло праводзіць і для якога цяпер «увесь свет нямілы»...

Можна ўявіць сабе жыццёвы шлях і жыццёвы вопыт кожнага з персанажаў карціны, настолькі трапна і ўсебакова яны ахарактарызаваны. Кожны—тып. Мастацкі тып. Можна шмат гаварыць пра багацце дэталяў. Пра іх прадуманасць. А жывапіс!.. Як смачна напісаны той жа «нацюрморт» на стале. Як напісаны людзі, сцены пакойчыка, ручнікі, адзенне, падлога!..

Трывалы малюнак. Сакавіты жывапіс. Глыбокае пранікненне ва ўнутраны свет чалавека. Удумлівы выбар тыпажу. Кампазіцыйныя вартасці карціны заслугоўваюць асобнай гаворкі.

У завяршэнне падкрэслю: малады мастак гэтай карцінай засведчыў немалыя свае здольнасці да творчасці.

Работа Антона Валатовіча не можа не радаваць. І калі, магчыма, я сёетое перабольшыў, занадта захапіўся карцінай (я пішу па першаму ўражанню), — хай гэта будзе, як кажуць, крытычны аванс.

Ул. БОЙКА.

Сярод кніг

ПОРУЧ З ПЕСНЯЙ

Кожны год на паліцах кнігарань з'яўляюцца новыя кнігі пра беларускіх кампазітараў. Выдавецтва «Беларусь» робіць карысную справу — чытач, нарэшце, можа сабраць патрэбную бібліятэчку, якая раскажа аб жыцці і творчым шляху творцаў нацыянальнай музыкі. Сярод аўтараў такіх кніжак часта сустракаецца імя Дзмітрыя Жураўлёва. Яго пяру належыць і першы біяграфічны даведнік «Кампазітары Савецкай Беларусі», дзе дадзены кароткія творчыя партрэты ўсіх нашых сучасных кампазітараў. Аўтар добра падрыхтаваны да такой работы: ён сам быў музыкантам і ўдзельнічаў у выкананні многіх навінак нацыянальнай музыкі ў пасляваенны час. Таму яго ацэнкі і характарыстыкі грунтуюцца на трывалых ведах.

Пра гэта сведчыць і нарыс, які выпусціла ленінградскае выдавецтва «Музыка».—«Ісак Ісакавіч Любан», пра аўтара папулярных не толькі на Беларусі песень «Бывайце здаровы», «Застольная», «Толькі з табою», «Не шукай ты мяне» і іншых. Заўважым, што некаторыя з іх слухачы лічаць народнымі: настолькі ўмела кампазітар «падслухаў» і перадаў настрої людзей, захаваўшы істотныя якасці фальклорнай масавай песні.

У кнізе прыведзена шмат цікавых фактаў з біяграфіі Ісака Любана. Спынюся на адным. Юнаком будучы кампазітар трапіў у Леменскую школу-камуну. Добра наладжанае навучанне, урокі музыкі, чулыя настаўнікі—Мадэст Мікалаевіч Лепяшынскі, Міхаіл Іванавіч Кернажыцкі, Канстанцін Ігаравіч Гатальскі—усё гэта спрыяла развіццю маладога таленту. Мадэст Мікалаевіч, напрыклад, заўважыў у хлопца матэматычныя здольнасці і прарочыў яму бліскучае будучае ў галіне дакладных навук. «Матэматыкам карысна ведаць і музыку», — і Мадэст Мікалаевіч, які добра іграў на скрыпцы, часта даваў у школе канцэрты, выступаючы дуэтам з выкладчыкам літаратуры Лаўрам Іванавічам Валюжэнічам. Слухаючы ігру настаўнікаў, Ісак пачаў раптам сумняварца: «А ці не музыка маё прызванне?» Ужо гэты факт, на нашу думку, акрамя ўсяго іншага, сведчыць ярка, як у першых савецкіх школах-камунах клапаціліва дбалі пра разнастайнае развіццё вучняў з беднаты.

Любан абраў музыку сваёй прафесіяй. Вучыўся ў Беларускім дзяржаўным музычным тэхнікуме, дзе на юнага кампазітара значны ўплыў зрабіў адзін з самых цікавых тады выкладчыкаў Я. В. Прохараў.

Дапытлівы і патрабавальны да сябе, Ісак Любан упэўнена робіць самастойныя крокі, прапагандуе сучасную музыку, піша першыя ўласныя творы. Яго прызначаюць мастацкім кіраўніком музычнага вяшчання Беларускага радыё. Чытачы кнігі даведваюцца пра першыя музычныя перадачы нашага радыё, пра пошукі цікавых форм і жанраў распаўсюджвання музыкі ў эфіры. Тут Любан быў сапраўдным энтузіястам. Гэта па яго ініцыятыве канцэрты па заяўках трансліраваліся не са студыі—наладжваліся непасрэдна на кватэрах ударнікаў пяцігодкі і перадаваліся па радыё на ўсю рэспубліку.

Мы прыгадваем гэта, бо на працягу ўсяго жыцця кампазітар аддаваў шмат энергіі прапагандзе савецкай музыкі.

Але галоўнае, вядома, — гэта творчасць Любана, якой у нарысе Д. Жураўлёва адведзены лепшыя, на мой погляд, старонкі. Аўтар кнігі раскрывае народныя вытокі твораў, напісаных адным з найбольш актыўных і вядомых савецкіх песеннікаў, спасылаецца на тое, як добра ведаў масавую песню часоў грамадзянскай вайны і развіў яе традыцыі І. Любан. Успрынятая ім у школе-камуне ад настаўнікаў-бальшавікоў рамантыка рэвалюцыі надае любанскім творам своеасаблівую «акрыленасць». Кампазітар «шукае» натхнення ў няспынных падарожжах—на граніцу да воінаў, на новабудоўлі, у калгасную вёску. Стваральны пафас часу, калі краіна будавала сацыялізм, паклаў яркі адбітак на музыку тых гадоў і, вядома, на музыку Любана. Нарысіст дае чытачам адчуць, як жыццё ўзбагачала музычную палітру кампазітара, чыё імя цяпер справядліва называюць, бывае, побач з імёнамі І. Дунаеўскага, А. Давідзенкі, Ц. Хрэннікава, Ю. Мілюціна, Н. Сакалоўскага, А. Аляксандрава.

Мабыць, для тых, хто прайшоў франты Вялікай Айчыннай вайны, назвы многіх песень Любана знаёмыя, як прозвішчы баявых паплечнікаў. Вельмі дарэчы будзе сказаць, што творчасць кампазітара была тады на перадавой лініі—там, у акопах і партызанскіх лагерах, пад баян і без акампанементу, «ад душы» спяваліся многія лірычныя і маршавыя мелодыі, створаныя Любанам. Яго песня, як кажуць, прайшла ваенны шлях, вытрымала выпрабаванне «на сталасць»—яна была патрэбна людзям.

Аўтар кнігі тактоўна і ўмела вядзе чытача па нялёгкіх дарогах станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай савецкай песні, паказваючы яе на фоне агульнага росквіту музычнай культуры рэспублікі. Добра, што Д. Жураўлёў раскрывае на канкрэтных прыкладах багацце творчай спадчыны кампазітара, які ўзбагачаў рэпертуар песнямі-маршамі, баладамі, рамансамі, жанравымі песнямі для эстрады, пісаў музыку для спектакляў беларускіх тэатраў і для кінафільмаў. Шмат якія з любанаўскіх твораў і дагэтуль карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў слухачоў.

У кнізе даецца спіс асноўных твораў І. Любана, названы паэты, на чые вершы ён пісаў музыку. Гэта пашырае нашы веды пра творчасць вядомага музыканта — перад намі нібы летапіс яго жыцця і творчых шуканняў.

Трэба спадзявацца, што чытач прыхільна сустрэне кніжку, якая з добрым прафесіяналізмам, папулярна разглядае шлях кампазітара, з імем якога звязаны значныя дасягненні песеннага жанру. На жаль, часам Д. Жураўлёў абмяжоўваецца паспешлівым пералікам і не паглыбляецца ў аналіз музычнай своеасаблівасці «почырку» І. Любана, быццам лічыць сваёй задачай іншы раз толькі зацікавіць чытача і выклікаць у яго жаданне яшчэ раз праслухаць песні кампазітара і звярнуцца да больш грунтоўных прац музыказнаўцаў. Але і такі «штуршок»—адна з задач папулярызатара.

І. ГОЛУБ.

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ:

Уладзімір ЯНКОЎСКІ

Уладзімір Янкоўскі — мой сябра. Пазнаёміліся мы з ім у Львове, дзе Валодзя заканчваў медыцынскі інстытут. Захапляўся ён тады (акрамя, вядома, сваёй медыцыны) мовамі, спортам. Там жа, у Львове, пачаў пісаць вершы.

Сёння 26-гадовы доктар Уладзімір Янкоўскі працуе ў Свіслачы, недалёка ад бацькоўскіх мясцін. Мы часта з ім сустракаемся. Некаторыя з сваіх вершаў ён прасіў мяне перадаць газеце «Літаратура і мастацтва», і я з ахвотай гэта раблю. Думаецца, у гэтых вершах ёсць нешта, што абяцае наперадзе паэта сапраўднага.

Сяргей ПАНІЗНІК.

ВЯСЁЛКА

Беларусь, колькі колераў, колькі фарбаў
ты ў ззянне вясёлкі сваёй назбірала!
І з якіх невычэрпных і казачных скарбаў
ты прамені і гожыя кветкі дастала!

Сінь, блакіт дзе ўзяла ты!..
З глыбінь у азёрах.
Назбірала на полі зацвіўшага лёну.
З васількоў, што сінеюць у жыце
ў разорах,
і з блакіту дзявочых вачэй задумённых.

А зялёныя фарбы у лесе сабраны —
ад бяроз ды ад соснаў,
дубоў гаманлівых,
і на полі, дзе рунь дываном разаслана,
і на лузе ў пракосах — дасвеццем
руплівым.

Але ёсць яшчэ колер зараніц і золакаў,
што пажарам ахоплівае небакрай.
У ім паўстанняў сялянскіх грозныя
сполахі,
лютай помсты чужынцам з захопніцкіх
зграй...

Хай над вольным прасторам у небе
празрыстым,
як намаляваная дзіўным алоўкам,
як цуд, пераліўчата і прамяніста,
ззяе над Беларуссю
вясёлка.

□ □ □

Гавары, не змаўкай, гавары —
для мяне ж гэта жаўранка песня,
што трапеча, звініць угары,
хвалі шчасця лье з паднябесся.

Гавары мне яшчэ, гавары —
ты ж як тая бярозка у полі,
што шапоча, трымціць на зары
сярод ніў залатых, на раздоллі.

Гавары, гавары, гавары.
Лепшай музыкі ў свеце не знаю.
Роднай мовы святыя дары
светлым смуткам мяне напаўняюць.

Гавары...

ЗАСУШЛІВАЕ ЛЕТА

У небе блакітным плывуць аблокі,
шпарка нясуцца ў вырай далёкі.
У далях знікаюць лёгкія цені,
як летуценні.

А пад нагамі засмяглая глеба
просіць у сонца, просіць у неба:
— Трэба вады мне. Дайце напіцца
вадзіцы.

Буйныя, цяжкія хмары, збярыцеся,
ліўнем праліцеся і напаіце
гэту зямлю. Напаіце дап'яну,
сухую, пясчаную...

Каб заквітнела, зазелянела
ўсё, што засохла, усё, што знямела.
Каб заспявала гэта зямліца —
дайце напіцца!

ПЕРШЫ—ЯНКА КУПАЛА

Маладзечанскі райком партыі і выканком раённага Савета дэпутатаў працоўных заснавалі раённую Кнігу народнай славы.

Першым у яе занесены Янка Купала. Народнаму песняру, які нарадзіўся на Маладзечаншчыне адведзена старонка кнігі.

У Кнігу народнай славы занесены таксама імёны акадэміка, грамадскага дзеяча, першага аўтара беларускай граматыкі Браніслава Адамавіча Тарашкевіча і яго паплечніка — намесніка старшыні Беларускай сялянска-рабочай грамады Заходняй Беларусі Сымона Аляксандравіча Рака-Міхайлоўскага.

Г. КАХАНОЎСКІ,
старшы навуковы супрацоўнік Мінскага абласнога краязнаўчага музея.

«НА ЛЯСНЫХ ФРАНТАХ»

Кніга з такой назвай выйшла нядаўна ў Вільнюсе. Яе аўтар — Альбертас Бараўскас, сакратар ЦК Кампартыі Літвы. А чвэрць стагоддзя назад ён — малады партызан— з аўтаматам у руках змагаўся з нямецка - фашысцкімі захопнікамі на беларускай зямлі.

Большая частка кнігі прысвечана апісанню гісторыі стварэння партызанскіх злучэнняў і цеснай баявой дружбы беларусаў і літоўцаў у гады суровых выпрабаванняў. Расказваецца пра месцы сустрэч і сумесныя дзеянні супраць фашысцкіх карных атрадаў і паліцэйскіх гарнізонаў у раённых цэнтрах Бягомль, Вілейка, Паставы, вёсках Зарубаўшчына, Лясіны, Бераснёўка, Ліпск, Канстанцінаўка, Своры.

Многія старонкі кнігі расказваюць пра камандзіра партызанскай брыгады «Спартак» А. Панамарова, начальніка Беларускага штаба партызанскага руху П. Калініна, былога першага сакратара Вілейскага падпольнага абкома партыі І. Клімава, першага сакратара Вілейскага падпольнага абкома камсамола П. Машэрава і іншых таварышаў, якія аказвалі дзейсную дапамогу літоўцам сябрам па зброі.

Л. КІСЯЛЕЎ.

Беларускі дзяржаўны універсітэт

З кнігі ЛіМа

ЗАПЛАНАВАНАЯ БЯЗДУМНАСЦЬ

Я ЕХАЎ у Лясную з Магілёва. «Волга» павольна пыліла па прасёлкавай дарозе, а я, гледзячы ў акно, спрабаваў уявіць сабе падзеі, якія адбываліся тут дзвесце шэсцьдзесят гадоў назад...

Па гэтай дарозе рухаўся дванаццацітысячны «Лятучы корпус» (карвалант) на чале з Пятром І. Рускія войскі вось-вось павінны былі нагнаць корпус генерала Левенгаўпта, які выйшаў з Прыбалтыкі на дапамогу Карлу XII. Шведы ўжо разрабавалі Бешанковічы, Астроўна, Лепель, Шклоў. Але рухаўся корпус павольна — затрымлівалі партызанскія атрады...

Недзе тут, пад Слаўгарадам, тагачасным Прапойскам, конніца Меншыкава і нагнала асноўныя сілы шведаў...

Мільгнуў перакошаны іржавы ўказальнік — «Лясная, 4 км». Мне прыгадаўся цудоўны абеліск з фігурамі рускіх грэнадзёраў па шашы Малаярославец — Масква ля павароту да вёскі Таруціна. А што ўбачу я тут?

Над верхавінамі рэдкага ельніку паказаўся знаёмы па рэпрадукцыях купал мемарыяльнай капліцы. Машына выехала з лесу на вялікае вытаптанае поле і... І тут я, проста кажучы, разгубіўся. Пазней, калі я ў Лясной пагаварыў з людзьмі, разгубленасць змянілася абурэннем.

Але спачатку пра некаторыя факты.

У верасні 1908 года мінула 200 гадоў з дня перамогі рускіх войск над шведамі пад Лясной. У памяць аб гэтым на полі бітвы быў устаноўлены помнік скульптара А. Обера—бронзавы арол, які разрывае сцяг ворага. Побач пачалося будаўніцтва мемарыяльнай капліцы. Жыхары Лясной, навакольных вёсак працавалі на будаўніцтве чатыры гады. Шэсцьдзесят гадоў стаіць ужо гэтая капліца. Яна ўцалела ў мінулую вайну, захаваўся і помнік.

Да 250-годдзя бітвы пад Лясной— у 1958 годзе—капліцу прывялі ў парадак і адкрылі ў ёй музей. Стварэнню яго дапамагалі Эрмітаж, Гістарычны музей у Маскве, Публічная бібліятэка імя Салтыкова-Шчадрына, Артылерыйскі музей. Пра бітву пад Лясной расказваюць экспанаты музея — агнястрэльная і халодная зброя пачатку XVIII стагоддзя, мемарыяльныя медалі ў гонар рускіх перамог у Паўночнай вайне, карціны, прысвечаныя барацьбе рускай армії і беларускага народа супраць шведскіх захопнікаў...

Музей урачыста адкрылі і... забылі. Бо як жа інакш растлумачыць тое, што я ўбачыў у Лясной?

У пяцідзесяці метрах ад капліцы пабудаваны кантора саўгаса «Лясная», два жылыя дамы—шаснаццаці- і васьмікватэрны. Пляцоўка паміж канторай і капліцай утрамбавана машынамі, забруджана. Увесь час пад'язджаюць і ад'язджаюць грузавікі, «газікі»—стаянка побач, пад капліцай. З правага боку поля пабудаваны белы домік—бальніца. Праз усё поле пралягла дарога.

Кіраўнікі саўгаса расказалі, што па генеральным плане забудовы Лясной насупраць капліцы будзе яшчэ ўзведзены Дом культуры, грамадска-гандлёвы комплекс і побач—стадыён. Вуліца прадоўжыцца, на полі стане яшчэ некалькі будынкаў.

— Ведаеце, мы не падумалі, не ўлічылі... — згадзіліся са мной парторг саўгаса І. Рыжанкоў і старшыня рабкома Д. Далькоў.—Забудову цэнтра саўгаса можна было б весці і ў іншым месцы. Зямлі ў нас хапае...

Ва ўсім вінавата абыякавасць. У гэтым пераканала мяне і размова, якую я вёў, вярнуўшыся ў Магілёў, з аўтарам праекта забудовы Лясной—архітэктарам аблпраекта Л. Чубоўскім.

— Так, я аўтар праекта. Гэта мая дыпломная работа.

— Няўжо вы не разумелі, што нельга забудоўваць гэтае поле магазінамі, адміністрацыйнымі і жылымі будынкамі? Гэтае ж поле—таксама помнік.

— Я не падумаў... У мяне была адна мэта—дыплом. Ведаеце, якая паспешлівасць заўсёды з дыпломам? Іншыя таварышы таксама не ўлічылі гэта, не падказалі...

«Іншыя таварышы» — гэта ў першую чаргу кіраўнік праекта, начальнік 1-й архітэктурна-праектнай майстэрні Д. Воранаў і кіраўнікі абласных упраўленняў сельскай гаспадаркі і культуры.

— А нам будаўніцтва Палаца культуры перад капліцай спрабуюць паднесці як падарунак,—гаварыў мне І. Мігулін, дырэктар Магілёўскага музея (у Лясной—філіял гэтага музея). — Ад кацельні Палаца культуры паабяцалі падвесці трубы для ацяплення музея. Там жа сырасць страшэнная, асабліва зімой... Псуюцца экспанаты. Можна было б, зразумела, гэтую праблему вырашыць інакш, не такой дарагой цаной.

Хапае ў музеі і іншых праблем, акрамя ацяплення. У 1958 годзе ў Мінску выйшла брашура З. Капыскага, Л. Клока, І. Мігуліна «Бітва пад Лясной у 1708 годзе» тыражом у пяць тысяч экземпляраў. У 1961 годзе Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла буклет «Бітва пад Лясной (экспазіцыя музея ў Лясной)». З таго часу музей ніяк і нідзе не рэкламуецца. Буклет і брашура даўным-даўно разышліся. На дарогах да Лясной ні з боку Магілёва, ні з боку Слаўгарада няма ні памятных шчытоў, ні проста ўказальнікаў аб блізкасці помніка ўсесаюзнага значэння.

І яшчэ хочацца сказаць вось што. Ля выезду з Лясной на Слаўгарад ёсць могілкі. На іх дзве брацкія магілы. У адной—рускія воіны, якія загінулі ў баі са шведамі. У другой — савецкія байцы, сярод якіх Герой Савецкага Саюза Пётр Панамароў. На адной магіле—строгі мрамарны абеліск з кароткім надпісам славянскай вяззю. На магіле Пятра Панамарова і яго таварышаў — нешта накшталт магільнай пліты—няўклюднае, самаробнае. Гэтую пліту калісьці сяк-так зрабілі мясцовыя жыхары. Час ужо ставіць сапраўдны помнік. Я гаварыў пра гэта з кіраўнікамі саўгаса.

— Не ведаем, з чаго пачаць, —развёў рукамі парторг І. Рыжанкоў.

А пачаць трэба з барацьбы з уласнай абыякавасцю. І не толькі кіраўнікам саўгаса «Лясная», але і слаўгарадскім савецкім органам, і абласному ўпраўленню культуры, і магілёўскім архітэктарам.

Зямля пад Лясной—свяшчэнная. Тут адбылася бітва, якая стала «маці Палтаўскай баталіі». Тут побач з салдатамі Сямёнаўскага, Прэабражэнскага, Інгерманландскага, Неўскага і іншых палкоў ляжаць савецкія байцы. Пра гэтае поле рускага патрыятызму, поле славы рускай зброі не трэба забываць ніколі. Павінна застацца недатыкальнай не толькі мемарыяльная капліца ў Лясной, але і поле бітвы, уся навакольная прырода. Толькі ўсё гэта разам выклікае ўяўленне аб даўно мінулых падзеях, а разам з імі і хвалюючае пачуццё гонару за нашу Радзіму.

С. БУКЧЫН,
тэлежурналіст.

НАЧНЫЯ СВЕТЛЯКІ

Наша рыбацкая палатка стаяла ў звонкім барку на высокім беразе. У лесе было шмат сушняку. Мы збіралі яго і палілі вогнішча: днём гатавалі сабе ежу, а ноччу адпуджвалі дымам назойлівых камароў, якія незлічонымі полчышчамі навальваліся на нас з лесу.

Неяк мы з сябрам позна заседзеліся на беразе і не прыпаслі паліва. Апоўначы наша вогнішча патухла. Разбуджаны машкарой, я выбраўся з палаткі і пасунуўся ў глыбіню лесу.

Адышоўшыся ад палаткі, я заўважыў, што ў цемры, пад дрэвамі, нешта цьмяна свеціцца. Здавалася, быццам у лесе былі раскіданы матавыя электралямпачкі.

Я падышоў да аднаго такога светляка і асцярожна наступіў на яго ботам. Пад нагой нешта хруснула. Адымаю нагу — зноў свеціцца. Я зноў наступіў і патрымаў той святляк пад ботам даўжэй. Адымаю — гарыць! Вось цуд які! Што ж гэта за такія дзіўныя лямпачкі ў лесе гараць, якіх патушыць нельга? Я ўтыркнуў каля кожнага светляка ў зямлю па сухой палачцы, сабраў сушняку і вярнуўся да палаткі.

Раніцай, як толькі прачнуўся, заспяшаўся ў лес. Ад'язджаючы знаёмае месца, я міжволі здзівіўся. Палачкі, расстаўленыя мной ноччу ў лесе, стаялі ля старых смарчкоў. Тут жа, побач з імі, былі і маладзенькія грыбкі, але яны не былі памечаны мною. Значыць, ноччу ў лесе свяціліся толькі старыя, пераспелыя грыбы.

Цяжка сабе ўявіць зайцаў, вожыкаў ды лісіц, якія ходзяць ноччу мяккімі сцежкамі, асветленымі дзівоснымі грыбамі-светлякамі. Цяжка, а яно ж так.

ПТУШЫНЫЯ ДЗІВАЦТВЫ

У птушак, як і ў людзей, ёсць свае дзівацтвы.

Узяць, напрыклад, лясного голуба. Гэтакая сур'ёзная і паважная птушка! А вось, аказваецца, і ў яе ёсць свая слабасць. Надта ж ужо голуб любіць вясной пахваліцца, чаго ён не робіць у другую пару года. Сядзе ранкам на елку, асіну альбо чэзлую сасонку і абавязкова будзе выхваляцца:

— На ду-у-бе сяджу! На ду-у-бе сяджу!

Іншыя птушкі змоўкнуць, стаміўшыся за доўгі веснавы дзень, а ён, не зважаючы ні на што, сваё чаўпе.

Назва маленькай птушкі — пеначкі-цяньконькі—гаворыць аб тым, што ёй абавязкова трэба быць у глухім цяністым лесе, дзе нават у поўдзень трымаецца шэры змрок і пахне цвіллю. А яна і ў светлым бярэзніку сустрэнецца, і на ўзлессі, а то і ў сад заляціць. І ўсё на святло лезе. Снуе шэрай кропкай дзенебудзь у макаўцы дрэва, ды ўсё насмешліва спявае:

— Цень-цень-цень! Цень-цень-цень!

А ценю і ў паміне нідзе няма.

Заранка, наадварот, увесь час у змроку трымаецца, а вось завецца, чамусьці, заранкай. У непралазным хмызняку яна і свае гучныя паспешлівыя песенькі спявае. Адно, што ў яе грудка барвовая, быццам яркай зарою залітая.

Есць свае дзівацтвы і ў шэрай зязюлі. Гучнае «ку-ку!» лясной бяздомніцы можна пачуць амаль у кожным ляску. А вось убачыць яе не так ужо і лёгка. Але я ведаю адно чароўнае слова. Варта мне яго толькі вымавіць, як зязюля робіцца паслухмянай. Якое гэта слова? Самае звычайнае «ку-ку», запазычанае ў самой жа птушкі. Захочацца мне яе калі пабачыць, саджуся ў густы куст, складваю далоні і крычу: ку-ку! Пачуўшы яго, зязюля са злосным кашляннем кідаецца на голас, часам падлятаючы да цябе на адлегласць выцягнутай рукі.

Шмат у лясного насельніцтва розных дзівацтваў ёсць. І разгадваць іх для мяне вялікая радасць.

СУНІЦЫ ПАСПЕЛІ

Як толькі ў зялёнай траве вам ветліва заківае галоўкамі чырвоная канюшына, бярыце кошыкі і адпраўляйцеся ў лес па суніцы. Дакладная прыкмета: зацвіла чырвоная канюшына—значыць паспелі ў лесе і духмяныя ягады.

Варта толькі знаць месцы, дзе суніцы шукаць. Ніколі не ідзіце за першымі ягадамі ў спелыя цяністыя лясы. Праўда, у такіх месцах летам у траве растуць самыя буйныя і сакавітыя ягады. Пакладзеш такую на язык і зараз жа па ўсім целе такі салодкі і халаднаваты струмень разальецца, які потым не раз успомніцца вам і халоднай зімой.

Але гэта будзе пазней. А пакуль што ў спелых лясах ягады яшчэ зялёныя і кіслыя. Лепш за ўсё за першымі суніцамі пайсці на лясныя пасекі і прасекі. Першыя чырванабокія ягады сустрэнуцца вам якраз тут, дзе амаль увесь дзень яркае сонейка свеціць, а ад старых сухіх пнёў, быццам ад натопленых печаў, цяплом патыхае. Вось тут, каля гэтых цёплых пнёў з рэдкай сухой траўкай вакол, і з'яўляюцца першыя чырвоныя ягады.

Калі лясныя прагаліны і прасекі задухмяняць суніцамі, у лесе пачынаецца сапраўднае свята. Усё лясное насельніцтва ў гэтыя дні спяшаецца салодкімі ягадамі паласавацца. Часам тут можна ўбачыць цяцерку-маці з жоўтымі пухавічкамі-цецеруняткамі. Старога адзінца-глушца ўзнімеш. З шумам з-пад ног вырвецца чубаты рабчык. Жаўтаротае зязюляня, з чырвонай ад ягад дзюбай, сустрэнецца.

Ну, а ўжо аб хлапчуках і казаць няма чаго. Толькі і чуюцца ў лесе іх гучныя галасы:

— Го-го-го! Ідзіце сюды! Дзе вы?

Хораша ў лесе, калі суніцы паспеюць.



Масюкоўшчына. Помнік ахвярам вайны.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

РЫГОРУ БЯРОЗКІНУ— 50 ГАДОЎ

Заўтра вядомаму нашаму крытыку Рыгору Бярозкіну спаўняецца 50 гадоў. У сувязі з гэтым праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Рыгор Саламонавіч!

Нам прыемна павіншаваць сёння Вас, сябра і таленавітага крытыка, з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння.

У Вялікую Айчынную вайну вы, будучы салдатам, прайшлі нялёгкія франтавыя дарогі, удзельнічалі ў многіх баях.

Мы помнім, як яшчэ ў юнацкія гады Вы прыйшлі ў літаратуру са сваім арыгінальным словам крытыка, асабліва пры аналізе твораў паэзіі. Вы старанна даследавалі і даследуеце савецкую паэзію — ад класічных твораў Уладзіміра Маякоўскага і Янкі Купалы да паэтычных узораў сучасных паэтаў. Найбольш ярка выявіўся Ваш талент даследчыка ў кнігах «Паэзія праўды», «Спадарожніца часу» і «Свет Купалы».

Ад усяго сэрца жадаем Вам, Рыгор Саламонавіч, моцнага здароўя, доўгіх год жыцця і новых творчых поспехаў».

□

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва», далучаючыся да гэтага віншавання, таксама горача вітае Рыгора Саламонавіча, свайго даўняга сябра, аўтара і супрацоўніка, з юбілеем і жадае яму ўсяго найлепшага ў жыцці і творчасці.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Між тых палёў. Пра зямлю, што натхняла Міцкевіча. Альбом. На беларускай і польскай мовах. Тэкст на беларускай мове і пераклад на польскую Янкі Брыля. Фотаздымкі Уладзіміра Калесніка. Мастак Арлен Кашкурэвіч. 1968 г. Тыраж 17.500 экз. Цана 1 руб. 24 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

Іван Навуменка. Вераніка. Апавяданні. Школьная бібліятэка. Мастак В. Шаранговіч. 1968 г. Тыраж 14.000 экз. 168 стар. Цана 32 кап.

На высокай хвалі. Літаратурна-крытычныя артыкулы. Зборнік. Пад рэдакцыяй Д. Бугаёва, Р. Шкрабы, Л. Курбекі. 1968 г. Тыраж 12.000 экз. 268 стар. Цана 45 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАВУКА І ТЭХНІКА»

Уладзімір Конан. Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі. Мастак Г. Малышаў. 1968 г. Тыраж 1.300 экз. 189 стар. Цана 44 кап.

Алесь Яскевіч. Ад слова да вобраза. Мастак В. Шаранговіч. 1968 г. Тыраж 1.300 экз. 116 стар. Цана 27 кап.

POLSKA AGENCJA INTERPRESS для ЛіМ

БРАТЭРСТВА, ЗМАЦАВАНАЕ КРЫВЁЮ

Гэты чалавек — адзін з тых, хто ў баях супраць гітлерызму ўласнай крывёю пісаў старонкі навейшай гісторыі, хто на франтах і ў партызанскіх атрадах закладваў падмурак польска-савецкага баявога братэрства. Ян Рачкоўскі. Салдат, патрыёт, камуніст.

Ён ваш зямляк. На Навагрудчыне прайшло яго маленства і юнацтва. Яму было толькі дзевятнаццаць, калі ён залічыў сябе ў рады народных мсціўцаў. Са сваімі таварышамі па зброі з атрада імя Шчорса брыгады імя Чапаева. Ён прайшоў па беларускай зямлі не адну сотню кіламетраў. І кожны крок на гэтым шляху быў выпрабаваннем на мужнасць, на адданасць народнай справе.

...Мінчане, якія 3-га ліпеня 1944 года з радасцю сустракалі воінаў-вызваліцеляў, сярод стомленых байцоў, што ішлі па вуліцах зруйнаванага горада, маглі бачыць і Яна Рачкоўскага, які ў складзе 65-й арміі генерала Батава вызваляў сталіцу Савецкай Беларусі.

Далейшы шлях маладога салдата ляжаў у краіну яго продкаў...

Скончылася вайна, але Ян Рачкоўскі рашыў звязаць свой лёс з арміяй, Войскам Польскім. Неўзабаве ён набывае прафесію ваеннага лётчыка, канчае вышэйшую вайсковую школу. Пасля гэтага малады афіцэр займае рад кіруючых пасад у польскіх ваенна-паветраных сілах і, нарэшце, становіцца камандуючым авіяцыяй Войска Польскага.

Сказаць шчыра, дамаўляючыся з генералам Рачкоўскім аб інтэрв'ю, я была не вельмі ўпэўнена, што нам удасца хутка сустрэцца. Я ведала, што ў камандуючага дзень распісаны літаральна па мінутах. Акрамя сваёй асноўнай, ён заняты яшчэ і вялікай грамадскай работай. Генерал — кандыдат у члены ЦК ПАРП і член кіраўніцтва Саюза барацьбітоў за свабоду і дэмакратыю. Гэта, натуральна, накладвае на яго шматлікія абавязкі.

Блізкія сябры генерала расказваюць, што ён вельмі цікавіцца літаратурай, гісторыяй і... верхавой яздой. Гэтая звычка засталася ў яго з партызанскіх часоў.

..Апасенні мае былі дарэмнымі — генерал Рачкоўскі, даведаўшыся пра мэту майго прыходу, прыняў мяне адразу.

— Я з задавальненнем падзялюся з беларускімі чытачамі ўспамінамі пра сваю партызанскую маладосць, — сказаў, усміхаючыся, Ян Рачкоўскі. — Наш атрад імя Шчорса дзейнічаў у раёне Мінска, Слуцка, Капыля. Камандзірам нашым быў Аляксандр Іванавіч Колчанка, мінчанін. Добры камандзір, выдатны чалавек і таварыш.

Баі, баі... Было іх многа. Рабілі мы рэйды па тылах ворага, у час якіх знішчалі гітлераўскія гарнізоны, пускалі пад адхон эшалоны. Ніколі не забыць мне баёў у Лаўскіх і Старыцкіх лясах з нямецкай карнай экспедыцыяй. У Лаўскіх лясах была вялікая партызанская групіроўка, якая ахоўвалася спецыяльнымі заставамі. Адна з застаў, якую ўзначальваў партызан В. Драздовіч, прыняла няроўны бой з наступаючымі карнікамі. Амаль усе партызаны загінулі смерцю героя. Іх бяспрыкладная мужнасць дазволіла арганізаваць абарону, выратавала сотні людзей.

Наш атрад удзельнічаў у вызваленні Капыля. Тут, у Капылі, мы сустрэліся з наступаючымі часцямі Савецкай Арміі. Тут я стаў салдатам 65-й арміі генерала Батава, з якой удзельнічаў у вызваленні Мінска.

— Відаць, у вас, таварыш генерал, засталося ў Беларусі шмат баявых сяброў?

— Так, заўсёды будзе жыць у маім сэрцы любоў да людзей, з якімі я дзяліў у тыя грозныя часы і гора, і радасць, і апошні кавалачак хлеба, і апошнюю дробачку солі.

З Беларуссю, з беларускім народам, у мяне звязаны самыя дарагія ўспаміны. Там я прыняў сваё баявое хрышчэнне, там я стаў камуністам.

— Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна пра сваё апошняе наведванне Беларусі.

— У другі раз я ўбачыў Мінск праз дваццаць два гады. Цяжка было паверыць, што гэты горад, светлы і зялёны, з мноствам новых раёнаў, шырокімі вуліцамі, горад радасці і хараства — тое самае месца, куды мы ўварваліся 3-га ліпеня 1944 года. Упартая памяць зноў і зноў выклікала тыя жудасныя малюнкі — вуліцы, заваленыя грудамі камення і цэглы, варонкі ад бомб, пераплеценыя, пагнутыя трамвайныя рэйкі, шкілеты дамоў, лесвічныя маршы, што віселі ў паветры. І ўсё-такі горад жыў! Памятаю, у той ліпеньскі дзень схуднелыя людзі, галодныя дзеці, усе, у каго толькі хапіла сіл ісці, высыпалі на вуліцу. Яны неслі кветкі—чырвоныя макі, гваздзікі, ружы. І ўручалі іх салдатам з усмешкай, з песнямі і слязьмі радасці.

Я ішоў тады па вуліцах і думаў, колькі працы, сіл і энергіі трэба будзе ўкласці, каб вярнуць горад да жыцця. Колькі потым вось такіх разбураных гарадоў, спаленых вёсак мне давялося ўбачыць і ў Беларусі, і ў роднай Польшчы, праз якія пралеглі мае франтавыя дарогі. І вось калі я быў у новым, адроджаным Мінску і слухаў расказы старых баявых сяброў пра тое, як народ аднаўляў сваю рэспубліку, якіх сіл і сродкаў, якой самаадданай працы гэта каштавала, я з гонарам расказваў і пра адроджаную польскія гарады і вёскі.

На вялікі жаль, я не змагу прыехаць у Мінск на сёлетняе свята вызвалення. Але паверце, сябры, — сэрцам сваім я буду з вамі. Я ўяўляю сабе, як яшчэ больш папрыгажэла сталіца Беларусі. Колькі з'явілася новых дамоў, вуліц, сквераў, колькі нарадзілася новых грамадзян гэтага прыгожага гераічнага горада.

Я яшчэ раз вяртаюся ў памяці да гадоў маёй ранняй маладосці, да былых баявых таварышаў, да зямлі беларускай, на якой 25 гадоў таму назад Войска Польскае атрымала сваё першае баявое хрышчэнне пад Леніна. Я думаю пра вёскі, праз якія я прайшоў разам з савецкімі партызанамі, пра Капыль і Старыцу, дзе я два гады назад з радасцю паціснуў руку васьмідзесяцігадовага Антона Мартынавіча Берніка, які некалі даў мне рэкамендацыю ў Камуністычную партыю.

Сёння, злучаныя братэрствам і дружбай, з'яднаныя сумесна пралітай крывёю, мы стаім разам на варце нашых гарадоў і вёсак, нашай зямлі, на варце вялікага сацыялістычнага лагера.

Жадаю вам, таварышы і сябры, шчаслівага радаснага свята.

Ірэна ШАДЗЕЎСКАЯ.

МЭТА КІНАДАСЛЕДАВАННЯ — ЧАЛАВЕК

НОВЫЯ РАБОТЫ ЛІТОЎСКІХ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ

КІНАМАСТАЦТВА Савецкай Літвы маладое. Першы буйны твор нацыянальнай кінематаграфіі — фільм «Марытэ»— з'явіўся на экранах два дзесяцігоддзі назад. Мінулыя гады адзначаны ростам творчых кадраў, удасканаленнем іх майстэрства, стварэннем раду значных карцін. Фільм «Жывыя героі» (пастаноўшчыкі — Вітаўтас Жалакявічус, Баліс Братаўскас, Марыёнас Гедрыс, Арунас Жабрунас) атрымаў галоўны прыз на міжнародным кінафестывалі ў Карлавых Варах у 1960 годзе. Стужка «Апошні дзень канікул» рэжысёра Аруныса Жабрунаса ўзнагароджана прызам «Сярэбраны ветразь» на міжнародным фестывалі ў Лакарна (1965 год). Карціна «Ніхто не хацеў паміраць» Вітаўтаса Жалакявічуса была прызнана лепшым фільмам краіны ў 1966 годзе.

Над чым працуюць літоўскія кінематаграфісты зараз? Зробім невялікае падарожжа па Літоўскай кінастудыі.

«Паварот» — так называецца шыракаэкранны фільм, здымкі якога нядаўна завершаны на студыі. Карціну аб пачатку вайны з фашысцкай Германіяй паставіў выпускнік Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі Барыс Ермалаеў па сцэнарыі, які напісаў у садружнасці з Львом Казарынскім. Гэта дыпломная работа маладога рэжысёра. Героі трапляюць у складаную сітуацыю, і аўтары даследуюць іх характары, паводзіны, адносіны адзін да аднаго. Фільм падзелены на тры навелы — «Андрус», «Рымас» і «Уладас» па імёнах галоўных герояў.

Тры падлеткі — тры розныя, даволі складаныя характары. Вясёлы, на першы погляд нават зухаваты Андрус, сустрэўшы фашыстаў, уцякае і гіне. Рымас добраахвотна застаецца з групай савецкіх байцоў, якія вырашылі да канца абараняць свой невялікі рубеж. Уладас становіцца надзейным памочнікам лейтэнанта Дубровіна, які, трацячы зрок ад атрыманай кантузіі, думае толькі аб выратаванні літоўскіх дзяцей, што нечакана апынуліся ў агні вайны.

Назва фільма азначае не толькі змену маршрута аўтобуса (хлопцы пасля экскурсіі ў Мінск спрабавалі на ім дабрацца дамоў) — яна нясе вялікую сэнсавую нагрузку: паварот у саядомасці герояў, абуджэнне пачуцця адказнасці перад сабой, перад людзьмі.

«Паварот» на традыцыйным кінафестывалі рэспублік Прыбалтыкі, Малдавіі і Беларусі быў прызнаны «лепшым фільмам для дзяцей і юнацтва».

Яшчэ адна стужка пачынае свой шлях да гледача. А ня студыі працягваецца нялёгкая, поўная спадзяванняў і трывог праца над новымі творамі экраннага мастацтва.

Здымачную групу фільма «Пачуцці» я застаў у шумным партовым горадзе Клайпедзе. Пастаноўшчыкі карціны, малады рэжысёры Альгірдас Даўса і Альмонтас Грыкявічус на працягу некалькіх гадоў працавалі ў дакументальным кіно, і цяперашняя карціна— іх дэбют у мастацкай кінематаграфіі. Сцэнарый напісаў вядомы літоўскі рэжысёр і кінадраматург лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Вітаўтас Жалакявічус па матывах рамана латышскага пісьменніка Эгана Ліва «Чортаў краж».

Месцам здымак стаў стары рабочы пасёлак Дрэвірнэ, што знаходзіцца на адлегласці трыццаці кіламетраў ад Клайпеды. Тут, у пачарнелым ад дажджу і салёных вятроў доме з бярвенняў, жыве рыбак Каспар, у ролі якога выступае таленавіты акцёр Рэгімінгас Адамайціс...

— Сцэнарый Жалакявічуса захапіў нас сваёй суровай рэалістычнасцю, яркасцю выведзеных у ім характараў,— гаворыць рэжысёр Альгірдас Даўса.— Перад намі няпросты лёс двух братоў, складаная любоў навучаных жыццём людзей. Дзеянне фільма адбываецца ў апошні перыяд акупацыі Літвы фашыстамі. Вызваленне літоўскай зямлі ад фашыстаў новым святлом азарае жыццё Каспара, але далёка не адразу зразумеў ён увесь сэнс гэтага.

У сталіцы Літвы — Вільнюсе рэжысёр Альгіс Арамінас прыступіў да работы над новай стужкай (некалькі месяцаў назад ён закончыў карціну «Шукай мяне»), сцэнарый якой ён напісаў разам з кінадраматургам Іцхакам Мерасам. Называецца будучы фільм «Калі я быў малады» і прысвячаецца сучаснай моладзі, дакладней, школьнікам старэйшых класаў. Зараз рэжысёр-пастаноўшчык разам са сваімі памочнікамі падбірае выканаўцаў вядучых роляў, часта бывае ў школах Вільнюса.

— Мае героі Томас і Ада ў тым узросце, калі маладыя людзі робяць першыя крокі ў сапраўднае жыццё,— гаворыць рэжысёр Альгіс Арамінас. — Яны перажываюць першыя пачуцці, першыя захапленні і першыя расчараванні. Іх чыстыя сэрцы нецярпімыя да ўсякага фальшу, адкрытыя для святла і дабра. Аднак далёка не ўсё так проста і лёгка бывае ў жыцці.

Альгіс Арамінас гаворыць аб тым, што велізарная адказнасць за тое, якімі будуць цяперашнія хлопчыкі і дзяўчынкі заўтра, кладзецца на дарослых. Мы можам і павінны быць больш далікатныя і ўважлівыя да сваіх дзяцей, пазбягаць усякага фальшу, усякіх масак. Свой фільм, паводле слоў рэжысёра, ён хоча адрасаваць і дзецям і дарослым. Карціну «Калі я быў малады» Арамінас будзе рабіць разам са сваім старым сябрам аператарам Данатасам Пячурам, які здымаў і стужку «Шукай мяне». Здымкі мяркуецца завяршыць да канца года.

І яшчэ адзін фільм аб дзецях у бліжэйшых планах Літоўскай студыі. Пісьменнік Юрый Якаўлеў напісаў сцэнарый, які пакуль умоўна называецца «Дзіцячыя гульні». Пастаноўку карціны ажыццявіць рэжысёр Арунас Жабрунас, які зняў фільм «Апошні дзень канікул».

Над некалькімі цікавымі стужкамі працуюць літоўскія дакументалісты. Адна з іх прысвечана Уладзіміру Ільічу Леніну. «Прыпынак у дарозе» — так называецца фільм, над стварэннем якога працуюць зараз малады гісторык-журналіст В. Бікуліч, рэжысёр Рымантас Шылініс і аператар Іёнас Абаронас.

У апошні час былі знойдзены новыя дакументы, якія дазволяюць больш поўна раскрыць акалічнасці і мэту прыезду Леніна ў верасні 1895 года, які ехаў з Берліна ў Расію. Ён сышоў з поезда на невялікай станцыі перад Вільнюсам і прыехаў у горад, ашукаўшы пільнасць жандараў. Тут ён меў важную сустрэчу з мясцовымі марксістамі, атрымаў свой перапраўлены сябрамі праз граніцу чамадан з нелегальнай літаратурай. У «Нарысах гісторыі Камуністычнай партыі Літвы» сказана: «Прыезд У. І. Леніна ў Вільнюс меў вялікае значэнне для далейшага развіцця рабочага і сацыялдэмакратычнага руху ў Літве».

— Наш творчы калектыў,— гаворыць дырэктар Літоўскай кінастудыі Юліс Лазарайціс,— бачыць сваю задачу ў тым, каб ярка, вобразна, праўдзіва расказваць пра час і чалавека мовай кіно. Жыццё дае багаты матэрыял для кінаследавання, галоўнай мэтай якога быў і застаецца чалавек, велізарны свет яго спраў, думак, пачуццяў.

Марк ТАТАРЫНАЎ,
спецыяльны карэспандэнт АДН.

ПАЛТАЎСКІ ТЭАТР У МІНСКУ

Сёння ў памяшканні акруговага Дома афіцэраў пачынае гастролі Палтаўскі дзяржаўны ўкраінскі музычна-драматычны тэатр імя М. В. Гогаля. З гэтым цікавым, старэйшым калектывам, якому сёлета спаўняецца 150 гадоў, мінскія гледачы пазнаёмяцца ўпершыню. У яго рэпертуары — сучасныя п'есы і ўкраінская класіка, аперэты, музычныя камедыі.

Палтаўскія артысты будуць у Мінску на працягу месяца. Апроч асноўнай сцэны, яны штодзённа будуць выступаць у раённых цэнтрах, калгасах і саўгасах.

ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ!

Цэлы месяц артысты Гродзенскага тэатра былі гасцямі сталіцы. З іх спектаклямі пазнаёміліся мінчане і жыхары Мінскай вобласці. Акцёры пабывалі ў раённых цэнтрах, у калгасах і саўгасах.

Работа калектыву тэатра адзначана Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР і Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры.

У мінулую суботу ў Доме мастацтваў адбылося абмеркаванне гастрольных спектакляў Гродзенскага тэатра, якое было наладжана Беларускім тэатральным аб'яднаннем. Размова ішла аб рэпертуары тэатра, аб мастацкіх якасцях і недахопах спектакляў, аб рабоце акцёраў і рэжысуры. З разборам спектакляў выступілі крытык Г. Колас і мастацтвазнаўца А. Саннікаў. У абмеркаванні прынялі ўдзел галоўны рэжысёр тэатра А. Струнін, дырэктар тэатра І. Міхалюта, галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР К. Губарэвіч, артысты Я. Кімберг, В. Грачынскі, Л. Сторажава, П. Філіпаў, С. Аляксандраў, А. Панкрат, У. Дзёмін, тэатразнаўца Т. Арлова, намеснік старшыні праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання В. Галіна.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

НА гастролях у Палтаве Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Я. Коласа паказаў прэм'еру новага спектакля — «Варшаўскую мелодыю» Л. Зорына. Пераклаў п'есу на беларускую мову М. Татур. Рэжысёр С. Казіміроўскі, мастак А. Салаў'ёў, кампазітар Б. Насоўскі. Палтаўчане цёпла сустрэлі гэтую работу тэатра.

На здымку, які зрабіў для нашай газеты артыст С. Кохан, вы бачыце Г. Маркіну ў ролі Гелены і У. Куляшова — у ролі Віктара.

ПРЫЗВАННЕ

Прыемна зайсці ва Уцёсаўскі сельскі клуб Баранавіцкага раёна, якім загадвае выпускніца сярэдняй школы Галіна Яроцкая. На ніве культуры знайшла Галіна сваё сапраўднае прызванне.

Вабяць вока маляўнічыя стэнды, плакаты, заклікі. Сацыялістычныя абавязацельствы саўгаса «Уцёс» на юбілейны год, календар працоўнай славы знаёмяць з буднямі гаспадаркі і перадавікамі вытворчасці. На стэндзе «Радзіма не забудзе» — фота землякоў-ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, побач прозвішчы аднасяльчан, што не вярнуліся дамоў з франтоў і партызанскіх атрадаў.

Цікавым быў у клубе літаратурна-музычны вечар «Рабі жыццё па Леніну». Зараз актывісты клуба рыхтуюць вечар пытанняў і адказаў «У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу». У плане работы клуба — вусныя часопісы «З днём нараджэння, рэспубліка мая», «На пяцігодку раўняй крок». У сельскім клубе часта гучаць музыка, песні. Аматараў самадзейнага мастацтва ў саўгасе нямала. Яны ўдзельнічаюць у гуртках, што працуюць пры клубе, — харавым, драматычным, мастацкага чытання, сольнага спявання, у агітбрыгадзе.

Сёлета самадзейныя артысты Уцёсаўскага сельскага клуба далі 15 канцэртаў, у тым ліку 10 вызязных.

На сельскай сцэне нядаўна адбылася прэм'ера купалаўскай «Паўлінкі». Ставіла гэты спектакль бібліятэкарка Бабко.

Я. КАЛЯДА.

МУЗЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ПА ВЕНГЕРСКАМУ МЕТАДУ

Венгерскае музычнае навучанне —або, як яго называюць за граніцай, метад Кадая — набывае ў свеце ўсё большую вядомасць. Гэтым метадам ужо карыстаюцца тысячы школ свету — лонданская школа Іегудзія Менухіна, бернская кансерваторыя, у Савецкім Саюзе: у Таліне, Ліепаі, Тбілісі і Кастраме, у сотнях школ ЗША і нават на астравах Фіджы У Тоніо створана Таварыства па вывучэнні венгерскай музычнай педагогікі, у Каліфорніі пры Стэндфардскім універсітэце працуе Інстытут музычнага выхавання па сістэме Кадая. У Парыжы выйшла кніга аб венгерскім музычным навучанні. У многіх месцах выпушчаны падручнікі спеваў па венгерскаму ўзору.

Метад венгерскага музычнага выхавання дэманстраваўся летась у Канадзе на сусветнай выстаўцы «ЭКСПО-67». 15 студэнтаў трэцяга курса Будапешцкай кансерваторыі пад кіраўніцтвам лаўрэата прэміі імя Эркеля, выкладчыцы кансерваторыі і кампазітара Эржэбет Сёні спецыяльна выязджалі ў Манрэаль, дзе штодзённа дэманстравалі славуты метад Кадая ў павільёне «Чалавек і музыка».

Сёлета ў Дзьёры адбудзецца І Усевенгерская канферэнцыя па пытаннях музычнага выхавання, на якой лепшыя выкладчыкі краіны падвядуць вынікі выкладання па метаду Кадая.

У папулярызацыі метаду Кадая вялікая заслуга эстэргомскага летняга універсітэта культуры. У 1967 годзе курс яго лекцый «Музычная адукацыя ў Венгрыі» заваяваў вялікі поспех у слухачоў, якія сабраліся з многіх краін. Варта прыгадаць, што адна аргенцінская выкладчыца, якая праслухала ў 1967 годзе курс эстэргомскага універсітэта, зараз выступае ў сябе на радзіме з лекцыямі аб венгерскім метадзе навучання музыцы. Сёлета ў эстэргомскім універсітэце будзе працытаны курс лекцый «Праблемы навучання ігры на музычных інструментах», які пазнаёміць слухачоў з далейшымі магчымасцямі ўжывання метаду Кадая. Універсітэт будзе працаваць з 12 па 26 ліпеня. На ўдзел у ім ужо паступіла 50 заявак з Вашынгтона, столькі ж —з Каліфорніі, 20 — з Англіі, многа слухачоў прыедзе з ГДР і Польшчы.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

2 ліпеня

Першая праграма. 10.05 — тэлевізійныя навіны (М). 10.15—«У кожнага свая дарога». Мастацкі фільм (М). 11.45 — «Літаратурная панарама» (М). 12.35 — «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 15.55 —для абітурыентаў. Кансультацыя па матэматыцы. 16.55 —«Навіны». 17.00 — праграма перадач. 17.05 — «Чалавек на рэйках». Кінанарыс. 17.35 — для дзяцей. «Калі ты застаўся ў горадзе». Рэпартаж з гарадскога піянерскага лагера «Арлёнак» г. Мінска. 18.05 — да Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Народжаны паэтам, загінуў салдатам». Пра грузінскага паэта М. Гелавані. 18.30 — дзіцячы экран. «Калабок». Мультыплікацыйны фільм. 18.40 — 50 гадоў беларускаму савецкаму спорту. «Мінск — міжнародная спартыўная арэна». 19.10 — «Навіны» (Уключэнне Брэста). 19.30 — «Сакрэтная каманда «Бумеранг». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма ГДР. Другая серыя (М). 20.30 —«Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — «Народны кантроль». Тэлевізійны часопіс. 22.00 — «Навела пра шкло». Кінанарыс. 22.10 — «За фасадам «свабоднага свету». «Пядзеі ў Францыі». Выступленне каментатара Л. А. Даўгучыца. 22.30 — «Старонкі вашых пісьмаў». Перадача-канцэрт. 23.15 — «Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма. 17.05 — тэлевізійныя навіны (М). 17.15 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 18.00 — для школьнікаў. «Сонцаварот». Перадача з Ленінграда. 18.30 — на II Усесаюзным з'ездзе настаўнікаў (М). 19.00 — «Свет сацыялізма» (М). 19.30 — М. Ю. Лермантаў. «Два браты». Тэлевізійны спектакль. 21.15 — «На музычнай хвалі». Канцэрт класічнай музыкі. Перадача з Ленінграда. 22.00 — «Праходзячы». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля па апавяданнях М. Горкага (М).

3 ліпеня

Першая праграма. 10.05 — тэлевізійныя навіны (М). 10.15 — «Сельская настаўніца». Мастацкі фільм (М). 16.00 — для абітурыентаў. Кансультацыя па матэматыцы. 17.00 — «Навіны». 17.05 — праграма перадач. 17.10 — XXII рэспубліканская Спартакіяда школьнікаў. «Дзённік спартакіяды». Перадача з Брэста. 17.30 — для школьнікаў. Да Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Дамайструйце за нас параходзікі...» 18.00 —першынство СССР па футболу. «Дынамо» (Тбілісі) — «Дынамо» (Кіеў). Перадача з Тбілісі. Другі тайм. 18.45 — «Навіны». 19.00 — «Чалавек нараджаецца для шчасця». Кінанарыс. 19.30 — «Сакрэтная каманда «Бумеранг». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма ГДР. Трэцяя серыя (М). 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — праграма каляровага тэлебачання (М). 23.00 — «Вам, вызваліцелі». Канцэрт па заяўках.

4 ліпеня

Першая праграма. 10.05 — тэлевізійныя навіны (М). 10.15 — «Праходзячы». Тэлевізійны спектакль па апавяданнях М. Горкага (М). 11.40— «Творчасць маладых». Дзень Беларускай ССР на Усесаюзнай выстаўцы прафтэхадукацыі (М). 15.50 — для абітурыентаў Кансультацыя па чарчэнню і маляванню. 16.55—«Навіны». 17.00 — праграма перадач. 17.05 — для выпускнікоў сярэдніх школ. «Абітурыент-68». «Акадэмія ў Горках». 17.50 — «Памяць сэрца». Тэлевізійная навела. 18.00 — «Палітычныя веды — у масы!». Вусны выпуск-часопіс ЦК КПСС «Палітычная самаадукацыя» (М). 18.30 — «Камуністычнай партыі Украіны — 50 гадоў». Перадача з Кіева. 19.00 — дзіцячы экран. «Каласок». Лялечны фільм. 19.30 — фестываль беларускага мастацтва, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Заключны канцэрт. У перапынку — «Навіны». 22.30 — «Злоўлены манах». Мастацкі фільм.

Калектыў Тэатра імя Янкі Купалы выказвае глыбокае спачуванне народнаму артысту СССР Л. Р. Рахленку з прычыны напаткаўшага яго горя — смерці бацькі.

Помнікі нашага краю

АНСАМБЛЬ НА ПЛОШЧЫ СВАБОДЫ

Цэнтрам архітэктурна-планіровачнай забудовы старажытнага Мінска была Саборная плошча (зараз плошча Свабоды). У XVII стагоддзі тут узвышаліся вежы манументальных будынкаў у стылі барока. Сярод гэтых збудаванняў былі Кафедральны сабор і Бернардзінскі манастыр.

Кафедральны сабор — адно з лепшых збудаванняў старога Мінска. Гэты храм разам з трохпавярховым будынкам з паўночнага боку ўваходзіў калісьці ў вялікі ансамбль Бернардзінскага мужчынскага манастыра, заснаванага ў пачатку XVII стагоддзя.

Знешняя архітэктура сабора мае ярка акрэслены базілікальны выгляд. Асноўную ўвагу невядомы дойлід звярнуў на афармленне галоўнага фасада. Тут больш чым дзе архітэктурна-дэкаратыўных элементаў. Дзве масіўныя 34-метровыя многаярусныя вежы аздоблены па вуглах прыступкавымі пілястрамі, арачнымі нішамі, а ў верхніх ярусах — арачнымі праёмамі.

Фасад між вежаў завяршаецца высокім брылем, упрыгожаным паліраваным карнізам і спаранымі прыступкавымі пілястрамі па краях. Брыль злучаецца з вежамі невысокімі ўвагнутымі сценкамі.

Архітэктурнае афармленне паўночнага і паўднёвага фасадаў выканана больш сціпла: тут толькі шырокія пілястры, паміж якімі ёсць шырокія арачныя вокны.

План будынка мае форму выцягнутага прамавугольніка (23×17,7). Шэсць масіўных слупоў дзеляць сабор унутры на тры прадоўжныя часткі — нефы. Сярэдні неф, як і ў іншых базілікальных храмах, шырэйшы і вышэйшы за бакавыя і заканчваецца вялікай трохграннай апсідай.

Насупраць Кафедральнага сабора размешчаны былы Бернардзінскі жаночы манастыр. У асноўным будынку манастыра — касцёле зараз размешчаны архіў.

Польскі гісторык Бялінскі паведамляе, што гэты касцёл і драўляныя манастырскія будынкі каля яго ўзведзены ў 1628 годзе. Пісьменнік Сыракомля з прычыны заснавання манастыра піша, што яго пабудаваў у 1624 годзе вядомы магнат Аляксандр Служка.

Значыць, помнік пабудаваны ў 30-х гадах XVII стагоддзя.

У мінулым стагоддзі ў будынку касцёла змяшчаўся «Сканцэнтраваны архіў дзяржаўных судовых месц Мінскай губерні». У прылеглым з захаду да касцёла манастырскім будынку быў воінскі «Зборны пункт».

У плане асноўны будынак уяўляе трохнефную базіліку. Сярэдні неф (яго вышыня 16 метраў) вышэйшы і шырэйшы за бакавыя і заканчваецца на ўсходзе алтарнай часткай. Даўжыня будынка—44,8 метра, шырыня—23,6 метра.

Знешняя архітэктура будынка бяднейшая, чым у Кафедральным саборы. Тут няма над галоўным фасадам шмат ярусных вежаў, характэрныя для культавых будынкаў.

Галоўны фасад будынка мае форму вялікай паўцыркульнай крывой. Адзінае ўпрыгожанне — пілястры. Бакавыя фасады, апрача гэтага, «ажыўлены» арачнымі вокнамі.

Будынкі Кафедральнага сабора і былога Бернардзінскага жаночага манастыра — добра захаваны архітэктурны ансамбль старажытнага Мінска.

І. ЭЛЕНТУХ,
вучоны сакратар Дзяржбуда БССР.

СПАДАРОЖНІКІ НАРОДНАГА МУЗЕЯ

У Гомельскім Палацы культуры чыгуначнікаў створан музей рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Каб пазнаёміць з экспанатамі музея чыгуначнікаў невялікіх станцый, раённы камітэт прафсаюза і праўленне Палаца стварылі некалькі спадарожнікаў музея. Яны абсталёўваюцца ў спецыяльных вагонах агітпаязду. Цэнтральнае месца ў спадарожніках-музеях займае выстаўка «50 год БССР і Кампартыі Беларусі». З агітпоездам выязджаюць лектары, якія расказваюць чыгуначнікам аб пяцідзесяцігадовым юбілеі нашай рэспублікі, аб поспехах працоўных Гомельшчыны, пра тэхнічны прагрэс на чыгуначным транспарце.

Р. СЫРКІН.

РАДЫ МАСТАКОЎ ПАПАЎНЯЮЦЦА

Закончылася абарона дыпломных работ на мастацкім факультэце Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута.

Сярод сёлетніх выпускнікоў факультэта — жывапісцы і графікі, манументалісты і мастакі па афармленні інтэр'ера і абсталявання, керамісты і мастакі-канструктары мэблі, афарміцелі тканін і мастакі-мадэліроўшчыкі вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці.

Характэрна, што большасць дыпломных работ, якія абараняліся,— рэальныя, г. зн. створаныя для тых ці іншых канкрэтных аб'ектаў. Так, напрыклад, Л. Каленік стварыў эскіз роспісу сцяны для кінатэатра «Гродна», а Р. Раманка — вітраж для клуба будаўнікоў у Гомелі. У. Наумаў распрацаваў праект інтэр'ераў рэстарана і віннага склепа для маладзёжнай гасцініцы на Заслаўскім вадасховішчы. Змястоўнымі творамі парадавалі маладыя жывапісцы і графікі. Іх работы прысвечаны сучаснасці і гераічнаму мінуламу нашага народа.

Рады беларускіх мастакоў папаўняюцца добра падрыхтаванымі спецыялістамі.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШКЕВІЧ, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНКЕВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 1. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 28-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-24-61, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-61, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-44-04, аддзела 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 0228